Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 ЖНІЎНЯ 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 156
(26514)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«Крытэрыі размеркавання дзяржпадтрымкі сельгаспрадпрыемстваў мэтазгодна змяніць»

Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час рабочай паездкі па Віцебскай вобласці запатрабаваў забяспечыць максімальную якасць уборкі збожжавых.

Аглядаючы збожжавае поле ў Талачынскім раёне, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Усе павінны быць зарыентаваны на якасць. Спяшацца сёння з уборкай нельга. Нават калі будуць праблемы, спяшацца не трэба, галоўнае — якасць». «Добра б яшчэ 1,5 млн тон збожжа намалаціць», — дадаў Прэзідэнт. Цяпер у Беларусі намалочана каля 7,5 млн тон збожжавых. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў забяспечыць намалот у 9 млн тон. «Мы гэта можам», — пераканаў ён. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, аб'ём сабраных збожжавых мог быць і большы, калі б не засуха ў пачатку лета і ліўневыя дажджы ў сярэдзіне. Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што збожжа на палях не павінна прастойваць. У большай ступені гэта датычыцца паўночных рэгіёнаў краіны. Таксама кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на неабходнасць якаснай уборкі кукурузы на зерне і насенне.

Закранаючы асаблівасці земляробства ў Віцебскай вобласці, Прэзідэнт запатрабаваў ад губернатараў вызначыць аптымальную структуру пасяўных плошчаў па культурах. У прыватнасці, у паўночным рэгіёне можна больш вырошчваць тых збожжавых, якія маюць менш працяглы перыяд вегетацыі. Таксама Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным аптымізаваць у вобласці асобныя напрамкі жывёлагадоўлі, у прыватнасці больш разводзіць буйной рагатай жывёлы, таму што для гэтага ёсць неабходныя плошчы сельгасугоддзяў і пашы, менш — свіней і птушкі.

Крытэрыі размеркавання дзяржпадтрымкі сельгаспрадпрыемстваў мэтазгодна змяніць. «Гэта ідэя, якую трэба прапрацаваць: давайце мы дапамогу «завяжам» на паказчыкі эфектыўнасці, на дынаміку прыбытку», — прапанаваў кіраўнік дзяржавы. «У каго больш прыбаўка, хто дэманструе дадатную дынаміку, таму і трэба даць больш», — дадаў ён. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што валавыя паказчыкі пры вызначэнні гэтых крытэрыяў не павінны дамінаваць. «Вал — гэта фон. Галоўнае — эфектыўнасць і прыбытковасць».

У сваю чаргу міністр сельскай гаспадаркі і харчавання краіны Сямён Шапіра праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб тым, што цяпер яго ведамства распрацоўвае новую сістэму ацэнкі дзейнасці сельгаспрадпрыемстваў. Таксама ў разлік бярэцца аб'ём валютнай выручкі, якую прыносіць прадпрыемства, падкрэсліў міністр.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка не мае намеру адмаўляцца ад асабістага кантролю сітуацыі ў вёсцы.

«Калі хочаш эфектыўна кіраваць сістэмай у цэлым — трэба бачыць, як працуюць падсістэмы, у гэтым выпадку АПК. Калі Прэзідэнт мае такія паўнамоцтвы па канстытуцыі і не ведае, як жыве селянін, то грош цана такому прэзідэнту», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Я сам павінен бачыць сітуацыю, размаўляючы на палях з механікамі, вучонымі, кіраўнікамі, абмяркоўваючы, як развіваць сельскую гаспадарку». Паводле слоў Прэзідэнта, усё гэта робіцца для вызначэння стратэгіі далейшага развіцця вёскі. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што часам узнікаюць праблемы. «Напрыклад, нас называюць бульбашамі, але цяпер у нас пазіцыі па бульбаводстве не такія, як былі раней. У гэтым годзе мы скончым прапрацоўку спецыяльнай праграмы, вызначым, колькі бульбы трэба для ўнутранага рынку, колькі — на экспарт. Але гэту культуру, вельмі каштоўную для нас, мы вернем. Яна рэнтабельная і перспектыўная». Закранаючы пытанні развіцця пладаводства ў краіне, Прэзідэнт адзначыў: «Пасадзілі добрыя сады. А што далей? Аказваецца, забыліся, што галоўнае перапрацоўка і захоўванне». У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка даручыў беларускім спецыялістам больш актыўна занядбаныя будаўніцтвам агароднінасховішчаў. «Значыць, важна бываць тут, вырашаць пытанні, таму адыходзіць ад жыцця сялян нельга», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МОЦ КАМЯНЁВАЯ

Літаральна за некалькі метраў ад сядзібы жыхаркі вёскі Язна Міёрскага раёна Валянціны ЦІТОВАЙ знаходзіцца магутны валун-следавік, большая частка якога схавана пад зямлёю. З-за пляскатай формы верхняй часткі яго называюць талеркавым і прыпісваюць легенду, нібыта на ім некалі снедаў сам Напалеон. Відавочна адно, што гэта прышлец са Скандынавіі, з'явіўся падчас апошняга абледзянення. Валянціна Цітова (на фотаздымку) лічыць, што гэты помнік прыроды аддае чалавеку добрую энергію.

У МАГІЛЁВЕ ІНІЦЫЮЮЦЬ ГОД РОДНАЙ МОВЫ

Комплекс мераў па прапагандзе беларускай мовы распрацоўваецца ў Магілёўскай вобласці.

Гэта работа пачалася пасля звароту да ўладаў краіны грамадзянскай ініцыятывы «Інстытут нацыянальнай памяці». Ва ўпраўленні ідэалогіі Магілёўскага аблвыканкама пагадзіліся, што сітуацыя вартая ўмяшання: руская мова стала асноўнай мовай стасункаў, а родная мова беларусаў, паводле ЮНЕСКА, знаходзіцца пад пагрозай поўнага знікнення.

Старшыня аблвыканкама Пётр Руднік даручыў распрацаваць комплекс мераў, дзе б былі сістэматызаваны высілкі па прапагандзе беларускай мовы органаў дзяржаўнай улады, дзеячаў нацыянальнай культуры, СМІ, грамадскіх арганізацый усіх узроўняў. Яго мяркуецца рэалізаваць у 2010 годзе, які магілёўскія ўлады прапануюць аб'явіць Годам роднай мовы. Комплекс мераў, над якім цяпер працуе рабочая група, будзе гатовы ў верасні. Свае прапановы выкажуць установы культуры і адукацыі. Выдаткі на выкананне прадугледзяць у абласным бюджэце.

— Падаецца, што кардынальна змяніць сітуацыю з беларускай мовай хутка немагчыма, — сказала **намеснік начальніка ўпраўлення ідэалогіі Магілёўскага аблвыканкама Людміла ПАНІЗОВІЧ.** — Патрэбен пераходны перыяд, каб адрадзіць беларускую мову ў грамадстве, сярод людзей.

Папярэдне мяркуецца, напрыклад, павялічыць колькасць гадзін выкладання культуры беларускай мовы ва ўстановах адукацыі, а ў дзіцячых садках прапанаваць выхавальнікам раз на тыдзень размаўляць з дзецьмі на роднай мове. Паводле прапаноў, у справу могуць уключыцца і першыя асобы вобласці і сельскіх раёнаў, і прамаўляць менавіта на беларускай мове ў асабліва значных і ўрачыстых выпадках. У тэатры плануюць больш спектакляў на роднай мове. Творчыя конкурсы, асабліва сярод моладзі, могуць стаць яшчэ адным дзейсным сродкам прыцягнення ўвагі да нацыянальнай культуры і літаратуры. Цэннікі ў крамах і меню ў грамадскім харчаванні можна рабіць на дзвюх дзяржаўных мовах. Беларускую мову, мяркуюць распрацоўшчыкі комплексу мераў, трэба больш шырока выкарыстоўваць на інфармацыйных экранах, у рэкламе і афішах па культурнай тэматыцы. СМІ гатовыя прапаноўваць матэрыялы аб захаванні і развіцці духоўнай спадчыны беларускага народа.

Ілона ІВАНОВА.

Халаднавата, а ў нядзелю яшчэ і дажджы

— паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.

У пятніцу і суботу ў зоне павышанага ціску на тэрыторыі краіны дажджоў не прадбачыцца, толькі ўначы і раніцай амаль паўсюдна ў нізінах чакаецца туман. Тэмпература паветра ў пятніцу 18—24, на захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей да 26 градусаў. У суботу ўначы пахаладае: тэмпература паветра складзе ўсяго 5—12 градусаў цяпла, удзень — 18—26. Ужо ў нядзелю да нас завітае чарговы атмасферны фронт. Уначы 7—14, удзень 18—25 градусаў. У першыя дні наступнага тыдня захаваецца ўмерана цёплае надвор'е. Уначы 9—15, удзень 18—25.

Сяргей КУРКАЧ.

Аднаразовую грашовую дапамогу на нарыхтоўку сельгаспрадукцыі атрымаюць 22,4 тыс. мінчан

Рашэнне аб аказанні такой дапамогі, а яе памер складае 3 базавыя велічыні (Br105 тыс.), прынята на сесіі Мінгарсавета.

Аднаразовую грашовую дапамогу на нарыхтоўку сельгаспрадукцыі атрымаюць зарэгістраваныя па месцы жыхарства ў Мінску ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і некаторыя катэгорыі асобаў, якія атрымліваюць пенсіі па лініі органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне горада. Гэта, у прыватнасці, інваліды I і II груп і атрымальнікі пенсій па ўзросце — пры ўмове, што яны па стане на 1 жніўня не працавалі, не былі зарэгістраваны ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў і памер іх пенсіі ў чэрвені гэтага года не перавысіў бюджэту пражыткавага мінімуму (Br243 тыс. 570). Акрамя таго, рашэнне сесіі гарсавета распаўсюджваецца на дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў і атрымальнікаў дапамог па доглядзе інваліда I групы або састарэлага, які дасягнуў узросту 80 гадоў.

П'ЯНЫ МІНЧАНІН УЦІХАМІРЫЎ СУСЕДЗЯЎ АЎТАМАТАМ КАЛАШНІКАВА

У двары свайго дома ён убачыў мужчыну, які гаварыў «на павышаным тоне» са сваёй маці. Малады чалавек нападпітку вырашыў не пакідаць без увагі некарэктнае стаўленне да пажылой жанчыны. Прыйшоўшы дадому, ён пераапрануўся ў камуфляж і, прыхапіўшы з сабой копію пісталета «SIG SAUER» і аўтамата «AKM-74», прызначаныя для страйкбола, вярнуўся назад у двор. Аўтаматам ён ударыў мужчыну ў грудзі, а пісталет навёў на жанчыну, патрабуючы, каб яны разышліся. Цяпер страйкбалісту пагражае да 10 гадоў пазбаўлення волі.

Кар. БЕЛТА.

Беларускія юрысты знайшлі спосаб абараніць натарыяльную здзелку ад прызнання яе несапраўднай

Беларускія грамадзяне цяпер могуць прыняць меры па папярэджанні прызнання натарыяльна засведчаных здзелак несапраўднымі, паведамілі БЕЛТА ў Мінюсце.

У натарыяльнай і судовай практыцы маюць месца выпадкі прызнання натарыяльна засведчаных здзелак (завяшчанняў, дагавораў) несапраўднымі, у тым ліку і пасля смерці ўласніка маёмасці. Як правіла, ініцыятарамі такога прызнання становяцца сваякі, наследнікі, не згодныя з тым, як уласнік распарадзіўся сваёй маёмасцю.

Вырашэнне пытання аб тым, як абараніць здзелку ад далейшага прызнання яе несапраўднай, знойдзена. Цяпер магчыма правядзенне добраахвотнай псіхіятрычнай або псіхолага-псіхіятрычнай экспертызы грамадзяніна да правядзення ім здзелкі. Гэта практыка прайшла апрабацыю ў Гродзенскай вобласці і пацвердзіла сваю эфектыўнасць.

У мэтах мінімізацыі выпадкаў прызнання здзелак несапраўднымі па прычыне недзеяздольнасці (нядзелказдольнасці) грамадзян на момант іх заключэння, натарыусы Гродзенскай вобласці праводзяць кансультацыі па пытаннях добраахвотнага правядзення платных псіхіятрычных і псіхолага-псіхіятрычных экспертыз, якія ажыццяўляюцца Дзяржаўнай службай медыцынскіх судовых экспертыз.

Такая экспертыза праводзіцца па пісьмовай заяве грамадзяніна, пры гэтым захоўваецца канфідэнцыяльнасць як самога факта яе правядзення, так і яе вынікаў, якія выдаюцца толькі заяўніку.

Мінюст цяпер вядзе работу па нарматыўнай рэгламентацыі гэтага станоўчага вопыту і распаўсюджванні практыкі такога кансультавання ўсімі дзяржаўнымі натарыусамі краіны.

Жыллё маё

КВАТЭРЫ Ў РЭГІЁНАХ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ТАННЕЦЬ

Ужо на працягу амаль васьмі месяцаў на другасным рынку жылля ў абласных цэнтрах працягваецца зніжэнне цэнаў. Гэта адбываецца не толькі ў выніку ланцуговай рэакцыі патаннення жылля ў Мінску, а яшчэ і пад уздзеяннем цэнавой дынамікі, якая назіраецца сёння ў рэгіёнах на першасным рынку камерцыйнай новабудоўлі.

Гомель:

ПРАПАНОВА «ЗАШКАЛЬВАЕ»

Паводле інфармацыі **кіраўніка РУП «Гомельскае агенцтва па аказанні рыэлтарскіх паслуг» Віктара СТРАХАНОВІЧА,** сёння другасны рынак жыллёвай нерухомасці гэтага абласнога цэнтра мае самы вялікі выбар усіх відаў кватэр. З пачатку фінансавага крызісу і да вясны прапанова і так павялічылася ўдвая. Летам на рынак трапіла дадатковая колькасць жылля, якое купляецца кліентамі вельмі нясмела. У выніку прапанова за лета павялічылася яшчэ на 20 працэнтаў.

Ці магчыма набыць невялікую кватэрку за 20 тысяч долараў? Амаль так. Зусім маленькая маласямейка з плошчай жылога пакоя каля 14 квадратных метраў і кухняй 5,2—5,6 «квадрата» прадаецца тут за 22 тысячы долараў. Сярэдні кошт аднапакаёвых «хрушчовак» вагаецца ў межах 25—27 тысяч долараў. Даволі якасныя аднапакаёвыя кватэры ў дзевяціпавярховых панэльных дамах каштуюць да 30—32 тысяч долараў.

Самымі таннымі двухпакаёвымі кватэрамі з'яўляюцца так званыя малагабарыткі (23—24 кв. метры жылой плошчы), якія каштуюць 28—30 тысяч долараў. Сярэдні кошт «двушак-хрушчовак» складае 32—34 тысячы долараў. Стандартныя двухпакаёвыя кватэры ў дамах палепшаных спажывецкіх якасцяў з кухняй ад 10 да 10,6 кв. метра каштуюць максімум 40—46 тысяч долараў.

Мінімальны попыт сярод патэнцыйных пакупнікоў назіраецца па сегменце шматпакаёвых кватэр. Цяпер у Гомелі можна адшукаць трохпакаёвыя «хрушчоўкі» з двума сумежнымі пакоямі і плошчай да 55 квадратных метраў, якія прапануюцца ўсяго за 35—37 тысяч долараў. Вельмі слаба ў горадзе купляюць і «брэжнеўкі», у якіх агульная плошча складае 60—62 кв. метра. Такія трохпакаёвыя кватэры таксама прапануюцца не даражэй чым за 36—40 тысяч долараў. Стандартныя трохпакаёўкі ў дзевяціпавярховых дамах каштуюць 50—55 тысяч долараў.

КВАТЭРЫ НАБЫВАЮЦЦА ДЛЯ ПРАЖЫВАННЯ

У папярэдніх радках мы агучылі цэны прапановы гаспадароў жылля. Гэта рэальныя рынкавыя цэны, але... Даволі хутка сёння па такім цэнніку кватэру прадаць цяжка. Тут існуе ўзровень цэнаў для імгненнага продажу. Звычайна гэта сапраўды маленькія аднапакаёвыя ці двухпакаёвыя кватэры, якія прапануюцца танней за рэальны рынкавы кошт недзе на 2—4 тысячы долараў. Такія кватэры прадаюцца на працягу аднаго-двух тыдняў. Не вельмі якаснае жыллё прадаюць танна для таго, каб пабудаваць сабе лепшае новае жыллё. Такія выпадкі сустракаюцца ўсё часцей. Хто набывае гэтае таннае жыллё? Можа, яго скупляюць, каб потым перапрадаць, новыя беларусы?

— Не, такія кватэры купляюць для пражывання іншагароднія маладыя сем'і, або для аднаго члена сям'і, калі разбураюцца сем'і і разам жыць у адной кватэры ўжо немагчыма, — расказвае Віктар Казіміравіч. — Тыя багатыя грамадзяне, якія ўкладваюць грошы з мэтай атрымання прыбытку, сёння яшчэ не рызыкуюць купляць жыллё, бо чакаюць магчымага далейшага патаннення жыллёвай нерухомасці.

Другасны рынак кватэр Гомеля цяпер яшчэ не дасягнуў свайго цэнаснага дна. Сярэдні кошт прапановы ліквідных кватэр складае 750—850 долараў за квадратны метр агульнай плошчы жылля. У гэты ж час, тыя асобы, якія не маюць магчымасці будаваць сабе жыллё па дзяржаўных праграмах у якасці чаргавікоў, сёння могуць набываць (будаваць) кватэры непасрэдна ў забудоўшчыка па лініі долевага будаўніцтва па кошце 680—750 долараў за квадратны метр.

> ***Багатыя гараджане, якія ўкладваюць грошы з мэтай атрымання прыбытку, сёння яшчэ не рызыкуюць скупляць жыллё, бо чакаюць магчымага далейшага патаннення жыллёвай нерухомасці.***

ПРЫВАТНЫЯ ДАМЫ ТАННЕЮЦЬ ЛЕДЗЬ-ЛЕДЗЬ

У апошнія 3—4 месяцы рынкам жыллёвай нерухомасці Гомеля сталі больш цікавіцца жыхары невялікіх гарадоў суседніх рэгіёнаў Расіі. Іншаземцы прыязджаюць жыць у Беларусь да свякрою. Праўда, яны набываюць не стандартныя кватэры ў шматпавярховых дамах, а прыглядаюцца і купляюць прыватныя дамы з упрадкаванымі зямельнымі ўчасткамі. Мабыць, дзякуючы і гэтаму фактару, дамы ў Гомелі цяпер амаль не таннеюць. Спецыялісты мясцовага рынку нерухомасці адзначаюць яшчэ адзін факт — у горадзе існуе зусім мала зямельных участкаў, на якіх магчыма пабудаваць прыватны дом ці катэдж. Сёння мінімальны кошт невялікага дома ў гэтым абласным цэнтры складае каля 40—50 тысяч долараў, а сярэдніх па якасці катэджаў — каля 60—80 тысяч долараў.

Магілёў:

ЖЫЛЛЁВЫ «КВАДРАТ» АБВАЛІЎСЯ ДА 700—800 ДОЛАРАЎ

Паводле інфармацыі спецыялістаў дзяржаўнага агенцтва нерухомасці г. Магілёва, невялікую аднапакаёвую «хрушчоўку» ў гэтым абласным цэнтры можна сёння набыць за 24—26 тысяч долараў. Двухпакаёвая «хрушчоўка» каштуе прыкладна 28—31 тысячу долараў. А вось двухпакаёвая кватэра большай плошчы ў дамах з палепшанай планіроўкай абыдзецца пакупніку прыкладна ў 35—40 тысяч долараў. На шматпакаёвыя кватэры ў Магілёве попыту ўвогуле амаль не існуе. Сярэдні кошт квадратнага метра нават даволі ліквіднай трохпакаёвай кватэры не дасягае 700—750 долараў. Жыллёвы квадрат стандартных аднапакаёвых і двухпакаёвых кватэр каштуе да 800—850 долараў.

Тут мы агучылі цэны, якія існуюць на рынку пры ажыццяўленні рэальных здзелак. Аднак шмат прадаўцоў (каля 60 працэнтаў) у інфармацыйных каталогах і зараз выстаўляюць свае кватэры па леташніх цэнах. Эксперты рынку ўпэўнены, што такое жыллё ў найбліжэйшыя часы так і не знойдзе сваіх пакупнікоў, бо кватэры па кошце каля 1000 долараў за квадратны метр у абласным цэнтры купляць ніхто не будзе. Сёння ў патэнцыйных пакупнікоў магілёўскай жыллёвай нерухомасці існуе альтэрнатыва будаваць камерцыйнае жыллё па кошце 750—900 долараў. Па логіцы, старое жыллё проста не павінна каштаваць даражэй за новыя сучасныя кватэры.

Гродна:

ДАРАГІЯ КАТЭДЖЫ ПАТАННЕЛІ ЎЖО НА 50—70 ТЫСЯЧ USD

За апошнія чатыры месцы кватэры ў Гродне на другасным рынку жылля патаннелі прыкладна на 20 працэнтаў. Мацней за ўсё за гэты час «абваліўся» цэннік на шматпакаёвыя кватэры вялікіх плошчаў.

ЧАСАМ ЗНІЖКІ ДАСЯГАЮЦЬ 5—6 ТЫСЯЧ USD

Паводле інфармацыі **дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Агенцтва па аказанні рыэлтарскіх паслуг г. Гродна» Валяр'яна СТОКІ,** самымі таннымі аднапакаёвымі кватэрамі ў горадзе лічацца старыя «хрушчоўкі», якія каштуюць цяпер да 23 тысяч долараў. Крыху большыя па плошчы «брэжнеўкі» каштуюць 25—27 тысяч, а стандартныя аднапакаёўкі ў дзевяціпавярховых дамах прапануюцца за 31—34 тысячы долараў. Двухпакаёвыя «хрушчоўкі» цягнуць сёння ўсяго на 30—32 тысячы долараў, а больш прасторныя кватэры палепшанай планіроўкі прапануюцца за 35—38 тысяч долараў.

> ***Катэджы, што раней каштавалі 220 тысяч, сёння выстаўляюцца на продаж усяго за 150—180 тысяч долараў.***

Маленькія па агульнай плошчы жылля трохпакаёвыя «брэжнеўкі» прадаюцца цяпер усяго за 36—37 тысяч, «хрушчоўкі» — да 43 тысяч долараў. Прасторныя трохпакаёвыя кватэры палепшанай планіроўкі каштуюць у межах ад 45 да 50 тысяч долараў.

Тут мы агучылі рэальныя цэны прапановы, але сустракаюцца выпадкі, калі жыхары Гродна пакідаюць нашу краіну назаўсёды і «скідваюць» сваю жыллёвую нерухомасць значна танней. У гэтых выпадках зніжкі складаюць ужо не звычайныя 1—2 тысячы, а часам 5—6 тысяч долараў.

ПОПЫТ НА ДАРАГІЯ КАТЭДЖЫ АМАЛЬ НУЛЯВЫ

Сёння ў Гродне самыя слабенькія па якасці прыватныя дамы прапануюцца пакупнікам за 35—36 тысяч долараў. Добрыя дамы і сярэдняя па якасці катэджы каштуюць каля 70—80 тысяч долараў. Шматпавярховыя катэджы эліт-класа выстаўляюцца на продаж за 130—170 тысяч долараў. Валяр'ян Стока адзначыў, што пасля пачатку крызісу колькасць здзелак куплі-продажу дамоў і катэджаў у горадзе паменшылася мінімум у тры разы.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БРЫТАНСКІ ПАРЛАМЕНТ РАССЛЕДУЕ ФАКТЫ ПРОДАЖУ УКРАІНАЙ ЗБРОІ Ў ГАРАЧЫЯ ПУНКТЫ

Брытанскі парламенцкі камітэт па кантролі за экспартам зброі апублікаваў справаздачу, у якой сцвярджаецца, што брытанскія пасрэднікі, магчыма, перапрадавалі зброю, набытую ва Украіне, у краіны, на якія распаўсюджваецца эмбарга.

У справаздачы камітэт выказаў занепакоенасць з нагоды таго, што брытанскі МЗС нічога не ведаў аб продажы Украінай зброі брытанскім пасрэдніцкім фірмам, хоць гэтая інфармацыя была лёгкадаступнай. Міністр замежных спраў Вялікабрытаніі Дэвід Мілібэнд загадаў правесці адносна магчымых здзелак расследаванне.

КІРУЮЧАЯ КААЛІЦЫЯ МАЛДОВЫ БУДЗЕ ДАМАГАЦЦА ЎСТУПЛЕННЯ КРАІНЫ Ў НАТА

Малдаўская парламенцкая кіруючая кааліцыя збіраецца правесці ўсенародны рэферэндум па інтэграцыі краіны ў НАТА. Аб гэтым мясцовай газеце Timpul («Час») заявіў лідар Ліберальна-дэмакратычнай партыі Малдовы Улад Філат, які, як мяркуецца, зойме месца спікера парламента.

Як адзначаюць эксперты, перспектывы ўступлення Малдовы ў НАТА па зразумелых прычынах сапсуюць адносіны рэспублікі з Расіяй. Між тым уступленне ў НАТА стане арганічным працягам палітыкі, якую праводзіць новая ўлада, дапускаючы магчымасць змены Канстытуцыі і агітуючы за актыўную інтэграцыю ў ЕС.

РАСІЙСКІЯ ДАІШНІКІ НЕ ЗМОГУЦЬ ВЫЗНАЧАЦЬ П'ЯНЫХ КІРОЎЦАЎ

Вярхоўны суд Расіі прыняў рашэнне, якое датычыцца ўсіх кіроўцаў. Ён адмяніў дзейсную дагэтуль норму, паводле якой даішнікі маглі самі вызначаць, п'яны кіроўца або не (для гэтага ДЗІБДР нават закупіла модныя алкатэстары).

Адмяніць дзеянне пункта 16 «Інструкцыі па правядзенні медыцынскага агляду на стан ап'янення асобы» ад 14 ліпеня 2003 г. запатрабаваў жыхар Омскай вобласці Азамат Сагнаеў. Ён заявіў, што падобная практыка парушае прэзумпцыю невінаватасці і супярэчыць Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэннях. Таму цяпер вызначыць, п'яны чалавек або не, можна толькі пасля паўнавартаснага медыцынскага агляду, які зможа выявіць канцэнтрацыю этылавага спірту ў крыві або выдыханым паветры (гэтага агляду можа запатрабаваць сам кіроўца, калі ён не згодны з дзеяннямі даішнікаў).

АНГЕЛА МЕРКЕЛЬ ЗАСТАЛАСЯ САМАЙ УПЛЫВОВАЙ ЖАНЧЫНАЙ СВЕТУ

Часопіс Forbes апублікаваў штогадовы рэйтынг ста самых уплывовых жанчын свету. У 2009 годзе верхні радок у спісе заняла канцлер Германіі Ангела Меркель.

Часопіс аддае першае месца Меркель ужо чацвёрты год запар. Адзначаецца, што Меркель змагла захаваць за сабой тытул самай уплывовай жанчыны нават нягледзячы на тое, што ў цяперашні час эканоміка Германіі перажывае нялёгкія часы. Варта адзначыць, што Меркель стала адзінай жанчынай-палітыкам, якая заняла месца ў першай дзясятцы рэйтынгу найбольш уплывовых прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва. У той жа час такія ўплывовыя жанчыны, як прэзідэнт Аргенціны Крысціна Фернандэс дэ Кіршнэр, лідар Чылі Мішэль Бачалет і прэм'ер-міністр Украіны Юлія Цімашэнка атрымалі ад складальнікаў рэйтынгу толькі 11-е, 22-е і 47-е месцы адпаведна.

Зварот у карпункт: вытворчая драма

НЕ ПАМЫЛІЦЦА Б...

Іншым разам пакінуць сельгаскааператыў лягчэй, чым вярнуцца назад

Думаў у час адпачынку нічога не пісаць, але калі з в. Навасёлкі Ляхавіцкага раёна пачалі тэлефанаваць людзі і прасіць прыехаць на сход калектыву СВК «Шлях новы», то давялося збірацца. Заінтрыгавала і тое, што напачатку сход павінен быў прайсці 19 жніўня а 15-й гадзіне на цэнтральнай сядзібе сельгаскааператыва, а затым чамусьці яго перанеслі на 8.15 раніцы ды яшчэ ў іншую вёску.

Калі я прыехаў у Вялікую Лотву, то, нягледзячы на ранні час, каля мясцовага клуба было шмат народу — чакалі кіраўніцтва раёна. А людзі сабраліся, каб вырашыць банальнае пытанне — прыняць у члены сельгаскааператыва аднаго чалавека. Працэдура фармальная, але на гэты раз людзі палічылі, што яна для калектыву лёсавызначальная. Рэч у тым, што ў гаспадарку вырашыў вярнуцца былы старшыня СВК «Шлях новы» Іван Клішэўскі. Чатыры гады Іван Іванавіч адпрацаваў на пасадзе кіраўніка раёна, але чаму б чалавеку зноў не ўзначаліць гаспадарку, якую ён зрабіў адной з лепшых у раёне.

Людзі паступова пачалі запаўняць залу ў клубе, пераважная большасць з іх была сярэдняга і малодога ўзросту. Пэўную колькасць месцаў займалі і пенсіянеры, але яны голасу не мелі. А калі кіраўнікі раёна прыехалі, то давялося пачакаць, пакуль падвязуць для кворуму людзей з фермы, якая знаходзіцца ў в. Гарбачы.

Пазіцыя раённай улады і работнікаў сельгаскааператыва не зусім супала. Калі першыя хацелі б каб СВК «Шлях новы» ўзначаліў Іван Клішэўскі, то калектыў не хацеў гэтага.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Калектыў галасуе.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.08.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 833,00
▲ 1 еўра	4 029,09
1 латвійскі лат	5 757,54
1 літоўскі літ	1 167,36
1 чэшская крона	157,28
1 польскі злоты	972,45
▲ 1 расійскі рубель	89,65
1 украінская грыўня	337,74

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	31,6011
UAH	37,6742
1000 BYR	11,0803
EUR	44,9842

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

«Крытэрыі размеркавання дзяржпадтрымкі сельгаспрадпрыемстваў мэтазгодна змяніць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На будучым тыдні плануецца сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым. «Мы ўжо даўно дамовіліся з Дзмітрыем Анатольевічам — і калі былі ў Кыргызстане на Ісык-Кулі — што нам у бліжэйшы час трэба абазначыць парадак дня, у які павінны быць уключаны найбольш складаныя пытанні, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Цяпер Прэзідэнт Расіі, як вядома, знаходзіцца ў Сочы, і ён запрасіў мяне сустрэцца». «Мы абмяркуем увесь спектр складаных пытанняў — тых, якія да гэтага часу не вырашаюцца», — дадаў кіраўнік дзяржавы. «Для мяне самае галоўнае — выходзіць з прынцыпу: дамовіліся — давайце выконваць. Гэта галоўнае, больш нічога не трэба, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Каб не было так, што мы з расійскім прэзідэнтам дамаўляемся, потым яны чагосьці чакаюць ад нас, мы — ад іх, а дамоўленасці не рэалізуюцца, таму што правальваюцца паверхамі ніжэй».

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што калі гэты прынцып будзе выконвацца, то перастануць правакавацца памылковыя меркаванні і спекуляцыі аб тым, куды накіравалася Беларусь, куды яна пераарыентавалася, якому вектару яна аддала перавагу (заходняму, паўднёваму або яшчэ якому-небудзь).

Прэзідэнт Беларусі лічыць выхад Грузіі з СНД памылкай кіраўніцтва гэтай краіны. «Я спадзяюся, што, магчыма, пройдзе час, раны зарубцуюцца і Грузія вернецца ў Садружнасць, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы ўсе гэта вельмі віталі б. Усе, у тым ліку Расія». «Зразумела, тое, што Грузія выйшла са складу Садружнасці, выклікае шкадаванне», — дадаў беларускі лідар. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што выхад Грузіі з СНД мае часткова фармальны характар, таму што ўсе дагаворы, у адпаведнасці з якімі Грузія нясе абавязацельствы перад краінамі Садружнасці, ёю будуць выконвацца і ў далейшым. «Гэта значыць, узятыя абавязацельствы грузінскае кіраўніцтва паабяцала свята выконваць», — адзначыў ён. Прэзідэнт зноў выказаў надзею, што Грузія вернецца ў склад СНД, тым больш што ніякай шкоды ад членства ў гэтай арганізацыі для Тбілісі няма.

«Я выказаў бы ўмераны аптымізм у плане разгрузкі складоў прадпрыемстваў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Дынаміка ёсць: 7—10 працэнтаў. Пажадана больш, але ў цяперашняй сітуацыі і гэтаму радуешся», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, па гэтым пытанні апошнім часам намеціліся невялікія зрухі. У многім паляпшэнню сітуацыі садзейнічала і работа СМІ.

«Чаму я крыху прытармазіў справаздачу ўрада? Я ўжо думаў, што яны наўрад ці павернуцца ў гэтай сітуацыі. Аказалася, павярнуліся, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Ураўнаважылася сітуацыя з нядрэннай дынамікай па выгрузцы складоў. Калі ўрад так будзе працаваць — значыць, ён чагосьці варты, калі зноў зваліцца — значыць, зноў паўстане пытанне па яго рабоце».

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў нездавальненне работай кіраўнікоў асобных прадпрыемстваў. «Я ўчора паставіў пытанне па кіраўніку «Гарызонта». Мы строга падыдзем да ацэнкі прадпрыемства. Там так нічога і не змянілася», — сказаў Прэзідэнт. Ён дадаў, што ёсць яшчэ шэраг такіх кіраўнікоў. «Калі яны не зразумеюць, што трэба дабаўляць, і дабаўляць значна, то мы адмовімся ад супрацоўніцтва з імі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Захад не павінен дыктаваць Беларусі ўмовы, лічачы, што ёй няма куды дзявацца з-за быццам бы пагаршэння адносінаў з Расіяй. «Хачу заўважыць: у нас добрыя, выдатныя адносіны з Расіяй. І калі на Захадзе думаюць, што могуць, карыстаючыся сітуацыяй, неяк націснуць на Лукашэнку, — яны памыляюцца», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Мы гатовы весці з Еўрапейскім саюзам дыялог па ўсіх пытаннях. Парадак дня вызначаны, і быццам бы дыялог ідзе нядрэнна, — адзначыў беларускі лідар. — Я не хачу лішні раз пералічваць тое станоўчае, што ўжо зроблена намі ў супрацоўніцтве з Еўрасаюзам. Я не адноўчы дзякаваў за тую падтрымку, якую аказаў нам МВФ, асобныя еўрапейскія дзяржавы. Мы неаднаразова размаўлялі аб інвестыцыйнай прывабнасці нашай краіны, аб тым, што да нас ідуць заходнія інвестары, і гэтак далей». «Але я скажу аб адной праблеме: хацелася б папярэдзіць еўрапейцаў, што калі яны думаюць, што можна пастаянна нам ставіць умовы, таму што быццам бы ў Беларусі з Расіяй сапсаваліся адносіны, і, маўляў, мы цяпер Лукашэнку падкруцім, ён усіх злачынцаў з турмаў павыпускае і зламае ўсё заканадаўства — яны памыляюцца».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, факт таго, што ў Беларусі ёсць праблемы ў адносінах з усходнім суседам, не азначае рэальнага пагаршэння беларуска-расійскіх адносінаў як такіх. «Няма праблем у тых, хто нічога не робіць», — сказаў ён.

Беларусь гатова працаваць на паўнапраўнай і ўзаемавыгаднай аснове як з Еўрапейскім саюзам, так і з ЗША. «Але разлічваць на сітуацыю, калі мы штосьці падкруцім, націснем, і беларускае кіраўніцтва вымушана будзе на нешта пайсці — на гэта на Захадзе няхай не разлічваюць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Мяне часта пачынаюць крытыкаваць, што вось Лукашэнка трымае ўладу. Але я надзелены такім правам згодна з Канстытуцыяй», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён дадаў, што «калі хто-небудзь на Захадзе разлічвае, што шляхам нейкіх махінацый гэту ўладу можна адняць і перадаць апазіцыі — нічога з гэтага не атрымаецца».

Прэзідэнт яшчэ раз падкрэсліў, што Беларусь імкнецца весці сумленны дыялог з Еўропай, і ўсё больш палітыкаў на Захадзе разумеюць гэта. «Але не трэба нас спрабаваць сагнуць праз калена. Мы ўсё роўна не памром, хоць у зямлянкі пойдзем, але свой суверэнітэт забяспечым», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле паведамленняў БЕЛТА.

Рэзалюцыя ПА АБСЕ, якая прыраўнавала камунізм да фашызму, — спроба перапісаць гісторыю

Такую думку выказаў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і сувязях з СНД Ігар Карпенка перад пачаткам круглага стала «Гістарычныя ўрокі — сучасная міжнародная палітыка», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Парламентарый нагадаў, што 23 жніўня гэтага года спаўняецца 70 гадоў з дня падпісання Дагавора аб ненападзенні паміж Германіяй і СССР, які ўвайшоў у гісторыю як пакт Молатава-Рыбентропа. «Сёння праз 70 гадоў некаторыя палітычныя дзеячы вырашылі даць сваю ацэнку тым падзеям. Можа, і можна было б не гаварыць аб гэтым дагаворы праз 70 гадоў, але мы яўна прасочваем спробу перапісаць гісторыю», — лічыць Ігар Карпенка.

«Парламенцкая асамблея АБСЕ летам гэтага года прыняла рэзалюцыю, якая фактычна ўраўноўвае віну СССР і Германіі ў развязванні Другой сусветнай вайны. Але гэта не гістарычныя факты, паколькі дагавору 1939 года папярэднічала мноства ваенна-палітычных падзей, якія нельга скідаць з рахунку, абмяркоўваючы гэты дагавор», — адзначыў дэпутат.

СССР спрабаваў стварыць сістэму калектыўнай бяспекі з прыцягненнем заходніх краін. Аднак заходнія дзяржавы фактычна спрабавалі нацкаваць Гітлера на вайну з Савецкім Саюзам. «Сведчанне гэтага так званая Мюнхенская змова 1938 года, якая фактычна развязала Гітлеру рукі. Ён не проста расчляніў і захапіў Чэхаславакію. Былі фактычна адкрыты вароты для пачатку Другой сусветнай вайны, і ў 1939 годзе СССР, так і не дачакаўшыся стварэння антыгітлераўскай кааліцыі, вымушаны быў заключыць пакт аб ненападзенні з Германіяй, які на два гады адцягнуў пачатак Вялікай Айчыннай вайны», — сказаў беларускі парламентарый.

«Мне хацелася б у сувязі з гэтай рэзалюцыяй убачыць, як заходнія дэмакратыі асудзілі таталітарныя рэжымы, напрыклад, у Іспаніі, Італіі, Партугаліі, Румыніі і Венгрыі напярэдадні Другой сусветнай вайны, і таталітарны рэжым Піначэта, зняцце прэзідэнта Гандураса, каланіяльныя войны той жа Францыі ў Паўночнай Афрыцы, Вялікабрытаніі ў Індыі. Аказваецца, гэта былі не таталітарныя рэжымы, а такім з'яўляецца толькі Савецкі Саюз, які на сваіх плячах вынес увесь цяжар вайны, і яго трэба прыраўнаваць да фашызму», — рэзюмаваў Ігар Карпенка.

Абзац

◢ Аэробус А-321 авіякампаніі Alitalia (нацыянальны перавозчык Італіі) зрабіў 19 жніўня ў 16.23 па мінскім часе вымушаную пасадку ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. Паветранае судна накіроўвалася з Масквы ў Рым. На яго борце знаходзіліся 6 членаў экіпажа. Над Віцебскай вобласцю ў самалёце адбылася разгерметызацыя салона. Экіпаж аэробуса запытаў дазволу на пасадку ў Беларусі.

◢ Выпуск пладовых вінаў у Беларусі за студзень—ліпень гэтага года знізіўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 9,6 працэнта. Запасы пладовых вінаў на складах склалі 0,9 млн дал — 57,9 працэнта да сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года яны павялічыліся на 7,9 працэнта. Вытворчасць вінаградных вінаў у Беларусі зменшылася на 9,1 працэнта. Выраблена 20,4 млн дал піва, што складае 92,9 працэнта да аналагічнага ўзроўню мінулага года.

◢ Увечары 19 жніўня пінскія памежнікі ў 500 м ад мяжы на тэрыторыі Рэчыцкага сельсавета з прымяненнем катэра «Казанка» затрымалі двух жыхароў Ровенскай вобласці. Сямейная пара накіроўвалася ў госці да сваякоў у Беларусі. Як высветлілася, дзяржаўную мяжу муж і жонка парушылі для скарачэння шляху. Пасля накладання штрафу ў Вг700 тыс. кожнаму затрыманыя былі перададзеныя ўкраінскім памежнікам.

Поўны абзац

◢ Мытнікі аэрапорта Барселоны арыштавалі нямецкага пенсіянера, у якога быў знойдзены какаін на суму 454 тыс. дол. 65-гадовы мужчына, які ляцеў з Барселоны ў Паўднёвую Амерыку, выклікаў падазрэнне ў супрацоўнікаў мытні сваімі занадта аб'ёмнымі сцёгнамі. Пры вобыску ў трусах затрыманага было знойдзена 160 пакуначкаў з какаінам, ушытых у тканіну з унутранага боку. Вага наркотыкаў склала 6,6 кг. «Сам мужчына быў не вельмі мажным, але ніжняя частка ў яго была вялікая, — расказаў прадстаўнік мытні. — Калі ён прысеў, было такое ўражанне, што ён сеў на яечную шкарлупіну. Ногі і сцёгны ў яго былі, як у сапраўднага штангіста. Мы бачылі мноства трукаў, але такія трусы — упершыню».

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

КАЛОДЗЕЖАМ КАРЫСТАЦЦА... ЗАБАРОНЕНА!

У Лепелі мясцовыя жыхары ўбачылі на дне калодзежа труп мужчыны. Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні МНС, выратавальнікі хутка паднялі яго на паверхню. У адзежы нябожчыка знайшлі ваенны білет і вызначылі прозвішча загінулага (нарадзіўся ён у 1946 годзе). Спецыялісты гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі да заканчэння работ па ачыстцы калодзежа (па вуліцы Чуйкова, каля 73 дома) браць з яго ваду забаранілі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ОСТРОШИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА

в опубликованном в газете «Звязда» № 148 от 08.08.2009 г. объявлении о проведении аукциона по продаже земельных участков **снимает с торгов лот № 1 и лот № 2.**

УНП 600181707. **Администрация.**

Минский городской центр недвижимости

ООО «КАМЕНЬ» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже административного помещения общей площадью 408,7 кв.м, с инвентарным номером 500/D-697247, расположенного по адресу: г. Минск, пер. Загородный 4-й, д. 56а, пом. 5.

Начальная цена – 1 071 600 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявку на участие в торгах; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); платежный документ с отметкой банка об исполнении, подтверждающий внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 100 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет ООО «Камень» № 3012000004939 в ОАО «Белгазпромбанк», г. Минск, код 742, УНП 101142344.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов указана в порядке проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **21 сентября 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявки на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **17 сентября 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;
(017)255 75 82 – ООО «Камень».

Спорт-тайм

РУМЫНЫ ПЕРАМОЖАНЫЯ

Баскетбалісты зборнай Беларусі з перамогі стартавалі ў 2-м крузе чэмпіянату Еўропы ў дывізіёне В. У Плоешці наша каманда з лікам 78:70 абгуляла зборную Румыніі. У турнірнай табліцы беларусы набралі 10 ачкоў з 10 магчымых і ўпэўнена яе ўзначальваюць.

ГОСЦІ БОЛЬШ АГРЭСІЎНЫЯ

У сераду адбыліся чарговыя матчы плей-оф Лігі чэмпіёнаў. Латвійскі «Вентспілс», які абгуляў на папярэдняй стадыі барысаўскі БАТЭ, у сябе дома быў разгромлены швейцарскім «Цюрыхам» — 0:3. Таксама перамогі ў гасцях, але з лікам 2:1, атрымалі венгерскі «Дэбрэцэн» над сафійскім «Леўскім» і ізраільскі «Макабі» над аўстрыйскім «Зальцбургам». У Ліёне мясцовы «Алімпік» пакуражыўся над бельгійскім «Андэрлехтам» — 5:1. Яшчэ ў адным матчы ва ўпартай барацьбе іспанскі «Атлетыка» адолеў у Афінах «Панацінаікас» — 3:2.

«ЮНАЦТВА» БЯРЭ ДРУГІ КУБАК

У Салігорску адбыўся фінальны матч Кубка краіны па хакеі. Перамогу ў ім атрымала мінскае «Юнацтва», якое абгуляла ў прынцыповым матчы таксама сталічны «Керамін» з лікам 3:1. Для каманды Міхаіла Захарава гэта ўжо другі выйграны Кубак краіны.

ТЫ ХТО, СЕМЕНЯ?

У кулуарах чэмпіянату свету па лёгкай атлетыцы толькі і гаворкі аб сенсацыйнай чэмпіёнцы ў бегу на 800 метраў паўднёваафрыканцы Кастар Семеня. Яна выйграла фінальны забег вельмі ўпэўнена, лідзіруючы практычна з першых метраў дыстанцыі, і бегла ў тыпова мужчынскай манеры. Многія прапаноўваюць пачакаць з вінаваннямі 18-гадовай спартсменцы да апублікавання вынікаў сэкс-кантролю. Ёсць падазрэнне, што яна — не зусім жанчына, а, магчыма, нават і мужчына. Семеня з'явілася практычна ніадкуль толькі ў апошнія месяцы перад чэмпіянатам свету, паказаўшы ў сябе на радзіме лепшы вынік сезона ў свеце — 1:56,72. Вынікі сэкс-кантролю не апублікаваныя і датуль 18-гадовы цуд з ПАР хаваюць ад рэпарцёраў.

Наўздагон

ПЛІТА ДЛЯ ВАЛЯНЦІНЫ БЫКАВАЙ

Інтэрнэт-карыстальнікі за два дні сабралі грошы на пліту для сястры народнага пісьменніка Беларусі

У нумары за 13 жніўня выйшаў мой рэпартаж з Ушачаў, з дома Валянціны Уладзіміраўны Быкавай, сястры знакамітага пісьменніка Васіля Быкава. Тады я пакінуў па-за кадрам адну дэталь.

Апроч дробных побытавых непрыемнасцяў (амаль павалілася прыбіральня, праламалася падлога ў кладоўцы, няма дрывотніка, падмурак рассыпаецца) я заўважыў, што пліта ў Валянціны Уладзіміраўны проста ў катастрафічным стане: старая, праржавелая, духоўка не працуе, унізе дзверцы адваліліся...

— Я сюды 32 гады таму замуж прыйшла, — пацвердзіла мае здагадкі гаспадыня. — Дык пліта была ўжо. Казалі, што гэтая пліта — самая першая ў вёсцы, ні ў кога яшчэ не было.

Як гэтая пліта грэла і не выбухала, я здзіўляюся дагэтуль. Вярнуўшыся ў Мінск, вырашыў правесці інтэрнэт-акцыю: сабраць грошы і купіць сястры Васіля Быкава новую пліту. Размясціў адпаведны заклік на сваім сайце www.labadzenka.by. І — што б вы думалі — за два дні (!) патрэбная сума (630 тысяч) была сабраная.

Кіраўнік Ушацкага райгазу Змітрок Талан адгукнуўся на просьбу дапамагчы — згадзіўся задарма прывезці і ўсталяваць пліту. Таму набываць яе я вырашыў там жа, ва Ушачах.

Калі мы прыехалі да Валянціны Уладзіміраўны з новай плітой (а я трымаў усё ў сакрэце, для гаспадыні гэта мусіла быць сюрпрызам), яна не паверыла сваім вачам. На дзіва дзіўнае збеглася паглядзець палова вёскі.

— Валька, прызнавайся, дзе столькі грошай узяла? — дапытвалася суседка.

— Бясплатна хлопцы прывезлі, — шчыра і разгублена адказвала шчаслівая ўладальніца новай пліты.

— Брашы-брашы! — не верыла суседка. — Хто цяпер што бясплатна прывязе!

Паўгадзінкі падключэння — і новая пліта прыдатная да працы. Валянціна Уладзіміраўна бы вучыцца размаўляць нанова — у старой пліце і ручкі не такія былі, і кнопак не было зусім. А тут — і электрычны падпал, і лямпачка ў духоўцы... Што праўда, паказваючы гаспадыні, як запальваць духоўку, я згадаў некалькі разоў нядобрым словам брэсцкіх канструктараў. Зрабіць такую маленькую дзірачку, ды яшчэ чорную на чорным... Каб запаліць яе, трэба мець дасканалы зрок і каардынацыю. У 83 гады — амаль нераадольная праблема.

— Дзякуй «Звяздзе», што напісала пра мае беды, — пасля «трэніровак» сядае на канапу гаспадыня. — Старшыня райвыканкама Алег Кавалёнак прыслаў да мяне жанчын з райсабеса, дык запісалі, што мне трэба, цяпер во мусяць работнікі прыйсці...

...Калі я купляў пліту ва Ушацкім райгазе, супрацоўніца доўга здзіўлялася нашаму кроку — сабраць грошы і падараваць пліту Валянціне Быкавай. І ўсё пыталася: «У яе дзень народзінаў, ці што?» Аднак мне здаецца, што рабіць адно аднаму добра трэба не толькі і не столькі ў дзень народзінаў, а тады, калі чалавеку напраўду патрэбная дапамога. Асабліва калі гэтаму чалавеку 83 гады, а брат жанчыны Васіль Быкаў праславіў Беларусь на ўвесь свет.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

***P.S.** Дзякую ўсім, хто аператыўна адгукнуўся і ахвяраваў на новую пліту.*

КВАТЭРЫ Ў РЭГІЁНАХ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ТАННЕЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мінімальны попыт вымушае прадаўцоў істотна зніжаць цэны. Так, калі паўгода таму добрыя катэджы каштавалі 220 тысяч долараў, то сёння — 150—180 тысяч долараў. Зніжкі могуць дасягаць дадаткова яшчэ 10—20 тысяч долараў.

КОШТ БУДАЎНІЦТВА ХУТКА ЗРАЎНЯЕЦЦА З ЦЭНАМІ ДРУГАСНАГА РЫНКУ

Што датычыцца кошту квадратнага метра кватэр, то па сегменце аднапакаёвых і двухпакаёвых кватэр маленькіх плошчаў ён складае каля 700—750 долараў. Самым танным жыллёвы «квадрат» атрымліваецца пры продажы трох- і чатырохпакаёвых кватэр вялікіх плошчаў. Па такіх кватэрах кошт яго ўсё часцей зніжаецца да 600—630 долараў. Кіраўнік агенцтва ўпэўнены, што прыкладна на гэтым цэнавым узроўні ў горадзе павінна пачацца стабілізацыя цэнаў другаснага рынку жылля. Сутнасць у тым, што за 650—700 долараў сёння ў горадзе прапануецца будаўніцтва кватэр па «далёўцы», праўда, без апрацоўкі.

На другасным рынку кватэры вялікіх плошчаў можна сёння набыць нават танней, чым пабудаваць па «далёўцы».

Існуе ў Гродне і другасны рынак зямельных участкаў. Аднак зараз ён дзейнічае крыху па шэрых схемах. Пакупнікам прапануецца зямля, на якой закансервавана будаўніцтва нейкага аб'екта. Зямельны ўчастак плошчай каля 15 сотак з такой даважкай каштуе ў прыгарадзе абласнога цэнтра ад 10 да 30 тысяч долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

Открытое акционерное общество «БЕЛОРУССКАЯ ВАЛЮТНО-ФОНДОВАЯ БИРЖА»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ,

которое состоится 3 сентября 2009 г. в 15.30 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 48«а».

Регистрация участников с 15.00 до 15.25.

Повестка дня собрания:

1. О внесении изменений в состав Наблюдательного совета ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
2. Об утверждении Положения о размере вознаграждений и компенсации расходов членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, сформирован на основании реестра акционеров по состоянию на 18.08.2009.

Для регистрации участнику при себе необходимо иметь документы, удостоверяющие личность и подтверждающие полномочия на участие в собрании.

Телефон для справок: 209 41 18.

НЕ ПАМЫЛІЦЦА Б...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Неўзабаве ў прэзідыуме занялі месца члены праўлення сельгаскааператыва і перад прысутнымі выступіў старшыня райвыканкама Дзмітрый Бурдук.

— Кіраўніцтва раёна не можа быць абыякавым да лёсу такой гаспадаркі, як ваша. На сёння СВК «Ляхавіцкі» і «Шлях новы» — вядучыя гаспадаркі раёна, і якім будзе ваш сельгаскааператыў заўтра — залежыць ад рашэння, якое вы прымяце зараз. Каго выбераце — з тым і будзеце працаваць.

Пазіцыю райвыканкама можна зразумець. Клішэўскі не быў «катом у мяшку», а ўжо паказаў, на што здольны. Менавіта пры ім гаспадарка дасягнула рэкордных па-

Старшыня райсавета Я. ЮРЛЕВІЧ і старшыня райвыканкама Д. БУРДУК.

казчыкаў. Адным словам, ад дабра дабра не шукаюць. І на погляд кіраўніцтва раёна, вяртанне ў гаспадарку Івана Іванавіча — бяспройгрышны варыянт. Для яго нават «зачысцілі месца» — кіраўніку СВК «Шлях новы», які ўзначальваў гаспадарку апошнія гады, далі больш высокую пасаду ў Баранавіцкім раёне.

Але прысутныя былі настроены рашуча, і стала зразумела, што паўплываць на іх погляд не ўдасца. І хоць вырашана было галасаваць тайна, пасля нядоўгіх дэбатаў людзі прагаласавалі адкрыта. За вяртанне Клішэўскага ў калектыў паднялі рукі толькі пяць чалавек. Дык чым жа так дапёк людзей былы старшыня, што яны не падтрымалі яго?

Але найперш паслухаем самога І. Клішэўскага. Яго выступленне перад землякамі было эмацыянальным.

— За 37 гадоў я ўпершыню адпачыў, бо да гэтага ні разу не быў у водпуску. Я стварыў у гаспадарцы нармальную базу і стараўся нікога не пакрыўдзіць *(шум у зале)*, хоць і даводзілася наступаць на адны і тыя ж граблі. Сёння ў фермы ўкладзена 28 млрд рублёў — гэта вялікія грошы і іх хутка давядзецца вяртаць, па 70 мільёнаў у месяц. Я ведаю, як зарабіць гэтыя грошы. Не хацелася б, каб гаспадарка пайшла па свеце без грошай. Што датычыцца мяне, то калі я ўжо не патрэбен вам, то дзякуй за адкрытасць. Маючы тры вышэйшыя адукацыі я не прападу — ужо пад вечар буду на працы...

Чым жа не дагадзіў былым падначаленым Клішэўскі?

Калі ўдзельнікі сходу пакідалі клуб, я задаў гэтае пытанне некалькім чалавекам.

— А ён нас за людзей не лічыў. Усім надакучыў, і Клішэўскага з гэтай прычыны многія не ўспрынялі, асабліва, нядбайнікі...

У Героя Сацыялістычнай Працы свой погляд.

Людзі не могуць быць «на адзін капыл». У кожным калектыве ёсць работнікі гультаяватыя ці тыя, хто не супраць зазірнуць у чарку, але ж не яны задаюць тон у жыцці СВК «Шлях новы». Калектыў здаровы з моцным патэнцыялам, а інакш сельгаскааператыў не хадзіў бы ў лідарах.

Але чамусьці ніхто з работнікаў гаспадаркі не сказаў добрага слова ў падтрымку былога старшыні. І нават тое, што І. Клішэўскі выступіў ініцыятарам будаўніцтва мясцовай царквы, і яна была ўзведзена на грошы гаспадаркі — ніхто не ўзяў да ўвагі. Можа таму, што ў зале было не так і шмат пенсіянераў. Значыць, не ўсё так адназначна.

У любым выпадку гэтае пытанне ўжо закрытае, але перад калектывам стаіць больш важная задача — выбраць новага кіраўніка сельгаскааператыва.

«Шлях новы» — гаспадарка моцная, але ці яна застанецца такой надалей у значнай ступені будзе залежаць і ад будучага старшыні.

Назіраючы за сітуацыяй збоку, на мой погляд, праўленне сельгаскааператыва павінна прыслухацца і да думкі кіраўніцтва раёна. Ва ўсякім разе, на сход калектыву павінна быць вынесена кандыдатура ўжо праверanая жыццём. Што датычыцца «Звязды», то людзі прасілі ад газеты падтрымкі. Маўляў, на калектыў могуць аказаць ціск. Не ведаю, ці прысутнасць карэспандэнта нешта змяніла, але галасаванне прайшло спакойна, і людзі адстаялі сваю пазіцыю. Мне заставалася выслухаць усе бакі і па магчымасці ўсё аб'ектыўна зафіксаваць.

«Звязда» заўсёды са сваімі прыхільнікамі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ, фота аўтара.

Ляхавіцкі раён.

Апошняе слова І. Клішэўскага.

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

21 ЖНІЎНЯ 2009 г. ПЯТНІЦА № 31 (15585)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ЧАМУ ЛЕПШАЯ БАДМІНТАНІСТКА БЕЛАРУСІ ПЕРАЙШЛА Ў ЗБОРНУЮ ПОЛЬШЧЫ?

Тры погляды

Яшчэ вясной стала вядома, што бадмінтаністка Вольга Конан адмовілася выступаць за Беларусь. Спартсменку ўспрымалі як медальную надзею нашай краіны на наступнай лонданскай Алімпіядзе. Сёння Вольга сцвярджае, што ніхто з беларускіх чыноўнікаў нават не прапанаваў ёй вярнуцца ў склад зборнай. Выходзіць, дзяржава адмовілася ад магчымага алімпійскага медаля? Карэспандэнт «Звязды» разбіраўся, чаму Вольга Конан са скандалам перайшла ў зборную Польшчы.

Цяперашні алімпійскі цыкл прынёс беларускаму спорту вялікія страты.

Спачатку дыскваліфікавалі нашых зорных кідальнікаў молата Івана Ціхана і Вадзіма Дзевятоўскага. Шанц, што спартсменаў апраўдаюць, мізэрны. Па-мойму.

А ўзімку кантракт з Міністэрствам спорту не падпісала юніёрская чэмпіёнка Еўропы па бадмінтоне Вольга Конан. Ад яе многія заўзятары спорту чакалі медаля на лонданскай алімпіядзе. Бо ў Пекіне 18-гадовая Конан заняла дзявятае месца і часам на роўных змагалася з вядомымі азіяцкімі чэмпіёнкамі.

Але Вольга з гучным скандалам з'ехала ў Польшчу і паведаміла, што будзе выступаць пад сцягам гэтай краіны.

«Я прапанавала запрасіць замежнага трэнера, а яны смяяліся»

З Вольгай мы сустрэліся ў Варшаве, дзе яна сёння ў асноўным жыве і трэніруецца. Дзяўчына мае пакой у вялікім катэджы разам з іншымі бадмінтаністкамі польскай зборнай.

— У Беларусі мой узровень дакладна не вырасце, — кажа Вольга. — Некалькі гадоў да пекінскай Алімпіяды я жыла і трэніравалася ў бадмінтонным лагеры нямецкага Саарбрукена. Са мной займаліся азіяцкія настаўнікі, былі добрыя спарынг-партнёры. Калі ж я вярталася ў Брэст, то мне не было з кім трэніравацца, не было спарынг-партнёраў. Нашы настаўнікі не здольныя вывесці мяне на Алімпійскі п'едэстал. Я прапанавала — давайце запросім азіяцкага трэнера. Бадмінтон — не футбол, замежнаму спецыялісту можна плаціць тры-чатыры мільёны рублёў, забяспечыць яго жыллём. Такім чынам у нашай краіне можна развіваць бадмінтон, атрымоўваць медалі на чэмпіянатах. Вынікі хутка з'явіліся б. Але нашым чыноўнікам гэта не патрэбна. З маіх слоў толькі пацяшаліся. Ім патрэбныя выступленні для адпіскі. А Вольга Конан — гэта костка ў горле.

«Разрыў звязкі мне лячылі як удар»

Бадмінтаністка запэўніла, што нават трэніруючыся за мяжой, не магла трываць зняважлівае стаўленне да сябе спартыўных чыноўнікаў.

— З лагера ў Саарбрукене я ездзіла на разнастайныя турніры. Вядома, дарогу павінны былі аплочваць у нашым Міністэрстве спорту, — працягвае Вольга Конан. — У бухгалтэрыі з мяне патрабавалі квіткі за пералёты і пераезды. Здаралася, мы ездзілі на спаборніцтвы на прыватным мікраўтобусе. Вядома, білеты мне ніхто не выдаваў, проста ўсе спартсмены скідваліся на паліва. Грошы мне даводзілася плаціць са сваёй кішэні. А потым у Мінспорту мне іх не вярталі, маўляў, трэба было ляцець самалётам і прывозіць квіткі. Ці гэта не знявага? Так з-за бюракратыі я выклала нямала сваіх грошай, хоць выступала пад беларускім сцягам.

Ці яшчэ адзін выпадак. Я траўмавала калена, адбыўся разрыў звязкі. І беларускі траўматолаг параіў перавязаць нагу і трошкі пачакаць, нібыта гэта моцны ўдар. Я вярнулася ў Саарбрукен і зразумела, што не магу выходзіць на корт, што дыягназ мне выставілі памылковы. У Германіі мне зрабілі бясплатную аперацыю, і яшчэ тры тыдні ад мяне не адыходзіў нямецкі ўрач, забяспечваў рэабілітацыю. Ці магчыма такое ў Беларусі? А на Бацькаўшчыне пасля ўсяго гэтага мяне нават не забяспечылі спецыяльным накаленнікам.

Пасля Алімпійскіх гульняў я спадзявалася, што легкадумнае стаўленне да мяне і да бадмінтона зменіцца . Але дзе там! Прапанавалі падпісаць кантракт, дзе графа «заробак» была пустая. І я прыняла рашэнне гэты кантракт не падпісваць. І з'ехала з Беларусі. Па-праўдзе, я спадзявалася, што ў Міністэрстве спорту адумаюцца, патэлефануюць мне, прапануюць прыстойныя ўмовы для трэніровак. Але мне дагэтуль ніхто не патэлефанаваў. Крыўдна, што я беларуска, а вымушана буду прыносіць медалі на афіцыйных турнірах іншай краіне. Але калі Мінспорту зменіць да мяне сваё стаўленне, то я яшчэ магу вярнуцца. Мне патрэбны нармальны заробак і добрыя ўмовы для трэніровак.

Мая мэта — калі не «золата» лонданскай Алімпіяды, то медаль іншага гатунку дакладна.

Беларускі пашпарт Вольга яшчэ не памяняла.

У ТОЙ ЖА ЧАС

Выступіць за зборную Польшчы на чэмпіянаце свету ў Індыі, які прайшоў на мінулым тыдні, Вользе Конан не дазволілі.

— Міжнародныя нормы такія, што цягам трох гадоў спартсменка не мае права выступаць за зборныя іншых краін, — паведамляе дзяржтрэнер Святлана Ляльковская. — Але палякі ўсё адно заявілі Вольгу на чэмпіянат свету. За гэта міжнародная федэрацыя выбачылася перад намі, а польская федэрацыя атрымае грашовае пакаранне.

Тым не менш Вольгу Конан запрасілі гуляць за наймацнейшы клуб Германіі Bischmischeim. Да гэтага Вольга перамагла лепшую спартсменку з гэтага клуба — кітаянку. Падрыхтавацца да Алімпіяды ў Лондане Вольга зможа без праблем, трохгадовы каранцін да гэтага часу скончыцца. Толькі за якую краіну згуляе бадмінтаністка на Алімпіядзе — гэта пытанне.

Бацькі Вольгі КОНАН:

«У ПЯЦІГАДОВЫМ УЗРОСЦЕ ОЛЯ МАРЫЛА, КАБ БЕЛАРУСЬ ВЕДАЛІ ПАЎСЮЛЬ»

Бацькі Вольгі Конан цалкам на баку дачкі. Яны ўпэўненыя, што выступаць за нацыянальную зборную з такім стаўленнем спартыўных чыноўнікаў было немагчыма. А дачку, нягледзячы на пераход у зборную Польшчы, лічаць патрыёткай.

— З самага дзяцінства яна марыла прыносіць славу Беларусі, — сцвярджае Надзея Лазараўна, маці бадмінтаністкі. — Калі Вользе было пяць гадоў, мы паехалі на адпачынак у Балгарыю. Аднойчы на пляжы з'явіліся клоўны. Яны сабралі дзяцей для конкурсу — хто хутчэй вып'е бутэльку лімонаду. Сярод дзетак была і наша Вольга. Яна прынялася за справу з імпэтам і першай праз трубачку высмактала ўвесь ліманад. А пасля гэтага сказала: «Я перамагла, таму што хачу, каб маю Беларусь ведалі паўсюль-паўсюль...».

Дарэчы, прыкладна месяц таму з мамай бадмінтаністкі не пацягнулі кантракт у цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па веславанні ў Брэсце. Аднак пасля таго, як у справу ўмяшаліся журналісты, кантракт з Надзеяй Конан працягнулі.

Пасля першых спаборніцтваў у жыцці пяцігадовая Оля (другое дзіця справа) заявіла, што хоча, каб Беларусь ведалі ва ўсім свеце.

Дзяржтрэнер па бадмінтоне:

«Нашы ўрачы не маглі назіраць за яе траўмай з адлегласці»

У Беларускай федэрацыі бадмінтона ўпэўненыя, што патрабаванні Вольгі Конан — гэта капрызы. А дагадзіць бадмінтаністцы проста немагчыма.

— Не магу сказаць, што Вольга Конан мала б зарабляла, — упэўнена **Святлана ЛЯЛЬКОЎСКАЯ,** дзяржтрэнер па бадмінтоне. — Графа «заробак» у кантракце была пустой, таму што яна запаўняецца на момант падпісання кантракта. Стаўка Мінспорту выплачвалася б па 22-м разрадзе, згодна з дасягненнямі спартсменкі. Гэта каля 600 тысяч беларускіх рублёў у месяц. Але Вольга атрымоўвала стыпендыю прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Доўгі час перад Алімпіядай ішла спонсарская дапамога.

Непрыемную сітуацыю з траўмай калена дзяржтрэнер Святлана Лялькоўская патлумачыла доўгай адсутнасцю Вольгі ў Беларусі.

— Траўма здарылася на турніры ў Швецыі. Галоўны трэнер зборнай быў гэтаму сведкам. Напачатку Вольга сказала, што траўма нязначная. Прыехала ў Беларусь, патрапіла на прыём да галоўнага траўматолага спартовага дыспансэра. Здымкі паказалі — разрыў ёсць. Але ўрач параіў не рабіць аперацыю, а паглядзець, што адбудзецца далей. У хуткім часе Вольга з'ехала ў Германію. І там праз некалькі месяцаў ёй зрабілі аперацыю. Упэўнена, што наш траўматолаг не памыліўся, папросту назіраць за развіццём траўмы было немагчыма з-за адсутнасці Вольгі.

А гісторыя з накаленнікам — таксама няпраўда. Я не магла дастаць свае грошы і за яго заплаціць. Трэба было пачакаць тыдзень, пяць дзён. Мы дзяржаўная арганізацыя і можам разлічвацца толькі па безнаяўным разліку. Але Вольга патрабавала, каб накаленнік з'явіўся імгненна.

«Фінансаваць замежнага трэнера — няма сродкаў»

У дзяржтрэнера Святланы Лялькоўскай мы спыталіся, чаму ў Беларусь не запрашаюць замежнага трэнера. Калі ўжо з'явіліся перспектыўныя бадмінтаністкі, як Вольга Конан, то чаму б не замацаваць гэты поспех, не прыціснуць хвасты азіяцкім спартсменкам?

— Фінансаваць замежнага трэнера магчымасці ў нас пакуль няма, — тлумачыць Святлана Лялькоўская. — Добраму замежнаму спецыялісту трэба плаціць не менш за пяць тысяч еўра штомесяц. А наконт спарынг-партнёраў, якіх Вользе Конан, па яе словах, у Беларусі не хапае, яна заўсёды магла спарынгавацца з мужчынамі. Упэўнена, што і сёння Вольга не зможа перамагчы нашых мужчын.

Прэтэнзіі Вольгі нас здзівілі. Адна шостая частка ад усіх сродкаў на развіццё бадмінтона ў Беларусі ішла на аплату яе турніраў.

— А што калі бадмінтаністка вырашыць вярнуцца ў зборную Беларусі?

— Мы не будзем секчы сук, на якім сядзім, і прымем яе. Мы спрабавалі з ёй звязацца і раней, прапаноўвалі абмеркаваць канфліктную сітуацыю, але Вольга не адказвала на нашы электронныя лісты. Відаць, цяпер яна павінна сама зрабіць крок нам насустрач.

Яўген ВАЛОШЫН.

Фота з архіва.

ПОГЛЯД ЗБОКУ

Канфлікт спартыўных чыноўнікаў і Вольгі Конан не выглядае адназначна. Спартсменка, дбаючы пра развіццё бадмінтона і сваю фінансавую стабільнасць, выставіла свае патрабаванні. На думку дзяржаўных чыноўнікаў, патрабаванні аказаліся завышанымі.

Але ці можна лічыць Вольгу Конан здрадніцай — вялікае пытанне. У свой час з Беларусі са скандалам з'ехаў гандбаліст Сяргей Рутэнка. Змяніў грамадзянства і з часам стаў самым дарагім гандбалістам свету. Сяргей даказаў, што падыход некаторых беларускіх чыноўнікаў да гандбола ў той час быў няправільны. А калі кіраўніком федэрацыі стаў Уладзімір Канаплёў — Рутэнку вярнулі.

Конан беларускі пашпарт таксама пакуль не змяніла.

Дык, можа, знойдзецца мудры чыноўнік, які здолее пасадзіць за стол перамоваў і Вольгу Конан, і бадмінтонную федэрацыю?

Некаторыя журналісты паспяшаліся спісаць Вольгу Конан з рахункаў. Маўляў, каб здабыць медаль на Алімпіядзе, трэба нарадзіцца з вузкімі вачыма, а еўрапейскія спартсменкі ім не канкурэнты. Такія пункты гледжання няхай застануцца слабакам. А пра Вольгу Конан, спадзяюся, мы яшчэ пачуем.

Ведай нашых!

ТРЫУМФ ЮНАГА БЕЛАРУСА!

Да сваёй абсалютнай перамогі на міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы гомельскі школьнік Генадзь Караткевіч ішоў некалькі гадоў. Тры гады таму беларусы выклікалі на міжнароднай алімпіядзе ў Мексіцы сапраўдны фурор, выставіўшы на спаборніцтвы 11-гадовага ўдзельніка, гэта пры тым, што ўзроставы цэнз для ўдзельнікаў алімпіяды складае 20 гадоў, а на алімпіяду прыязджаюць, як правіла, выключна старшакласнікі.

Такім чынам беларускі школьнік, які перайшоў на той момант толькі ў шосты клас, стаў самым маладым удзельнікам алімпіяды за ўсю гісторыю яе правядзення. Але ўжо першая яго спроба выступлення на звышпрэстыжных інтэлектуальных спаборніцтвах стала для маленькага гамяльчаніна надзвычай паспяховай — дамоў ён вярнуўся з сярэбраным медалём, прычым па колькасці набраных балаў толькі крышачку не дацягнуў да залатой узнагароды. Дзве другія спробы прынеслі яму два залатыя медалі. Прычым летась юнак займаў у асабістым рэйтынгу ўжо сёмую пазіцыю. А сёлета стаў, нарэшце, абсалютным пераможцам, і зноў самым юным за ўсю гісторыю правядзення алімпіяды, набраўшы найвышэйшую колькасць балаў (743) і абышоўшы моцных супернікаў з Японіі, Кітая і Карэі. Напрыклад, японец, які заняў у асабістым рэйтынгу другое месца, адстаў ад абсалютнага пераможцы на 14 балаў. У кітайцаў, якія падзялілі трэцюю-чацвёртую пазіцыю, у актыве 721 бал. Нагадаем, што Гена Караткевіч закончыў у гэтым годзе толькі восьмы клас гімназіі № 56 горада Гомеля. А на міжнароднай алімпіядзе, якая праходзіла сёлета ў Балгарыі, выступалі больш як тры сотні ўдзельнікаў з 85 краін свету.

Надзвычай удала выступіў у Балгарыі і Дзмітрый Багданаў (выпускнік Ліцэя БДУ), які ўвайшоў па колькасці набраных балаў у першую дзясятку (645 балаў), заваяваўшы залатую ўзнагароду. Яшчэ адзін медаль (сярэбраны) — у Арцёма Вольхіна, які таксама з'яўляецца выпускніком Ліцэя БДУ. А рыхтаваў беларускую зборную тандэм гомельскіх педагогаў — Міхаіл Далінскі і Алена Міняйлава.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАДАРОЖЖА да цэнтра сусвету

Збіраючыся ў далёкую вандроўку, мы звычайна спадзяёмся даведацца больш пра чалавечы свет. А бывае так, што ў той жа момант ты адкрываеш самога сябе. Трапіўшы з Цэнтра Еўропы ў месца, якое называюць калыскай еўрапейскай цывілізацыі, хацелася дакрануцца да нечага вельмі сапраўднага, чароўна-містычнага, такога, дзеля чаго варта горы варочаць...

Ніколі не думала, што здольная на ўчынкі, якія патрабуюць нечалавечых высілкаў. Прызвычаіўшыся сядзець у кабінеце ці на канапе, зручна і хутка перасоўвацца па зямлі на транспарце, мы часам адчуваем сябе слабымі, эканомім сілы, ці нават думаць не думаем, што іх у нас шмат. Ну, калі б мне хто-небудзь сказаў, што магу без спецыяльнай падрыхтоўкі пайсці ў далёкі паход па горных сцежках, я б падумала: толькі ў вар'яцкім стане, зусім страціўшы розум, напэўна...

Як дрэнна я сябе ведала! Цяпер разумею, што дзеля нечаканых здзяйсненняў і адкрыццяў часам варта пагаджацца на авантуры, здрадзіўшы банальным уяўленням пра адпачынак. Тым больш, што прамаці еўрапейскай цывілізацыі — востраў Крыт — хацелася прайсці ўздоўж і ўпоперак. Гэта легендарнае месца, дзе нараджаліся і жылі старажытныя грэчаскія паданні і міфы. Самы буйны востраў Грэцыі паводле адной з версій называюць абломкам загінулай Атлантыды. Уявіць, як яна магла выглядаць, можна, напрыклад, калі накіравацца ў глыб вострава, у самае яго сэрца, дзе шмат што захавалася да нашых дзён не тое што праз стагоддзі, а нават праз тысячагоддзі — нездарма ж кажуць: хто не быў у Самарыйскай цясніне, той не бачыў Крыта.

ХОЧАЦЦА І КОЛЕЦЦА

Так кажуць турыстычныя агенты, якія прадаюць падарожжы ў Самарыйскую цясніну па ўсім востраве: прыгажосць некранутай прыроды падарожнікі аглядаюць на працягу ўсяго горнага шляху, які складае...18 кіламетраў.

Аднак жа гэта самая працяглая і прыгожая горная цясніна Еўропы! Толькі тут, калі пашчасціць, можна ўбачыць рэдкі від жывёл — казу кры-кры. Каза легендарная, бо калі ў адной з пячор Крыта нарадзіўся бог Зеўс, маці яго тут кінула, ратуючы ад злога бацькі, які паядаў усіх сваіх дзяцей. Выкарміла магутнага Зеўса менавіта каза кры-кры. Але гэта не самы вялікі цуд Самар'і. Супрацоўніца агенцтва, мясцовая жанчына, тлумачыць: ёсць, вядома ж, кароткі шлях, кіламетраў на пяць, але што там можна ўбачыць? Прайсці поўны шлях сваімі нагамі абсалютна рэальна (нават дзеці з 6 гадоў дапускаюцца), тым больш, што сярод гор больш прахалоды, чым на ўзбярэжжы. Ісці няцяжка, калі ты не хворы і адпаведна апрануты: Самарь'я — хоць і мае статус Нацыянальнага парку Грэцыі, але прагульвацца па ім трэба ў спартыўным абутку і зручным адзенні, прыхапіўшы бутэльку вады і бутэрброды — прагулка зойме гадзін сем-восем...

Вузкая горная брама.

Прыгатаваная з вечара паходная ежа ўсяляла надзею: не дам сканаць. Хоць усю дарогу да аўтобуса, які адвозіць да пачатку шляху, сумненні ўсё яшчэ заставаліся. Напэўна, таму, што начыталася звечара ў даведніку, што шлях у Нацыянальны парк Самар'я адкрыты для турыстаў з 1 мая па 15 кастрычніка, а ў астатні час тут моцныя патокі вады і каменяпады. Цяпер лета, але заўсёды ёсць верагоднасць, што нешта пойдзе не так... «Там ёсць пляцоўка для верталётаў на выпадак надзвычайных здарэнняў», — супакойвае мяне муж, які, мабыць, чытаў іншыя даведнікі.

Пад'ехаў поўны аўтобус такіх жа аптымістаў. І я супакоілася: ўсе сядзяць такія ўпэўненыя, нават усміхаюцца... У сне — зразумела я крыху пазней. Ад'язджаем жа раненька, сонца яшчэ не ўстала.

Лінія Крыцкага мора, уздоўж якога мы ехалі да гор, плаўна перацякла ў свядомасць стужкай глыбокага як вада сну, падобнага на мае начныя жахі пра сусветны патоп, які накрывае нас хвалямі горнай ракі. Абудзіў бадзёры голас гіда: мы праязджалі плато Амалас, адно з самых вялікіх на Крыце. У святле першых сонечных промняў уздоўж дарогі жыццесцвярджальна паўставалі аліўкавыя гаі. За імі раптам адкрылася паселішча. Прыстанак для турыстаў, якія збіраюцца ў доўгі шлях па Самар'і, магчымасць падсілкавацца ў кавярні, да якой адзін за другім пад'язджалі аўтобусы — у адным гавораць панямецку, у другім — па-французску, з трэцяга даносіцца англійская... І ўсе бягуць хуценька па каву. Раніш-

Традыцыйны крытскі арнамент — амаль родны.

ні холад канчаткова запэўніў: жарты скончыліся, вы ў гарах. Нашы, пастаяўшы ў чарзе, узгадваюць пра свае бутэрброды. Коштаў на булкі няма, але нехта напарадзе заплаціў за дзве, нібыта за сняданак у рэстаране, што дапамагло канчаткова прачнуцца. Гэта стала першым, але не самым цяжкім выпрабаваннем на шляху у сэрца Крыта.

Самарыйская цясніна такая старажытная, што нават уявіць цяжка: яна ўтваралася на працягу 14 мільёнаў гадоў. Тэктанічныя зрухі накіроўвалі горныя водныя плыні ад гары Лефка-Оры і гары Валакіяс. Вада імкнулася да мора і пракладвала больш глыбокае і вузкае ложа. Уздоўж яго і вядзе вузкая сцяжынка.

ХАЧУ І МАГУ!

Паўтарала я раз за разам, пад кожны крок, што набліжаў да стартавай пляцоўкі. Мы былі наверсе, а погляд уніз прыкмеціў вузкія прыступкі, па якіх ужо ішлі, спускаліся, спаўзалі ўніз з гары людзі, якія прыехалі, каб адчуць гонар за тое, што завуцца еўрапейцамі.

Апошні інструктаж: прыступкі лесвіцы, якая ідзе на спуск, цягам часу сцерліся і сталі слізкімі. На парэччы лепш не абапірацца, бо дрэва гніе хутка, і невядома, у якім стане той ці іншы адрэзак драўлянай агароджы, а гара высокая... Трэба выбраць свой тэмп, не ісці надта хутка — вялікая нагрузка на суставы. І калі ёсць сумненні, то лепш увогуле не ісці, бо вярнуцца назад ужо нельга і кожны будзе сам-насам з гэтымі доўгімі кіламетрамі... Сцежка сама выведзе, куды трэба, а Яна, наш гід, пойдзе самай апошняй. «Каб падбіраць трупы...» — жартуе нехта.

Сціснуўшы ўваходны квіток за 10 еўра, нібыта гэта быў пропуск у іншы свет, я паскакала ўніз, нібыта тая загадкавая кры-кры. Бо нешта падказвала, што можна не паспець на той бок вострава (мы праходзілі яго ўпоперак), каб своечасова патрапіць на карабель і адчаліць да гатэля. Так думала не толькі я: усе, хто стаў на гэты слізкі шлях, адразу вельмі шпарка прыступілі да справы — толькі пыл ад ног папярэднікаў стаяў перад вачыма. Паспрабуй тут агледзець прыгажосць навакольля! Ды і спыніцца было не надта проста: стаў на вузкай сцежцы сфатаграфавацца — ужо ўтварыў затор.

Бліжэй да сярэдзіны спуску я ў думках падзякавала супрацоўнікам Нацыянальнага парку Грэцыі, калі ўбачыла першую пляцоўку для адпачынку. У гарах стаяла цывільная прыбіральня з туалетнай паперай і рукамыйнікам. У цені дрэў крынічка з чысценькай вадой — зняла стому, якая раптам навалілася на плечы. І гэта толькі адзін кіламетр шляху! Хацелася сесці на лаўку, любавацца пейзажам... І нікуды не ісці.

«Вось вам і крыніца нацыянальных даходаў: пратаптаў сцежку, запусціў турыстаў у Прыпяцкі запаведнік ці на Браславы, прыдумаў розных баек, якія зацікавяць, не толькі нас, і прадаваў квіткі за еўра...» — разважаў хлопец з нашай групы. — «Не, масавы турыст да нас не пойдзе, — пярэчыла дзяўчына. — Складана будзе з прыбіральнямі...» Група нашых суграмадзян старанна фіксавала ўсё навокал на сваю фотакамеру, усё больш пераконваючыся, што ўвесь гэты парк настолькі сэрцу блізкі, што здаецца: навошта было ехаць так далёка? Ну, безумоўна, горы...

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ФУТБАЛІСТЫ Ў СУТАНАХ

Футбольны матч паміж каталіцкімі святарамі і свецкай моладдзю днямі пройдзе ў Браславе. Матч прымеркаваны да штогадовай сустрэчы моладзі Віцебскай епархіі. Сустрэча будзе праходзіць чатыры дні і, паводле папярэдніх звестак, збярэ каля 400 чалавек. Спатканне пройдзе напярэдадні важнай падзеі — каранацыі абраза Маці Божай Валадаркі Азёраў.

Паказаць моладзі, што вольны час можна праводзіць з карысцю, прычым не толькі ў малітвах — адна з асноўных мэтаў сустрэчы, кажа адзін з арганізатараў сустрэчы айцец Лешак Вітвіцкі. Падобнае мерапрыемства праводзіцца ўжо чацвёрты раз. Добрай традыцыяй стала і гульня ў футбол.

Таксама традыцыйна падобныя турніры адбываюцца і ў Слоніме (Гродзенская епархія), дзе ў лістападзе чакаецца 5-ы турнір па міні-футболе памяці Яна Паўла II.

— Асаблівых патрабаванняў да складу камандаў няма, — расказвае **ксёндз-вікарый Гродна-Аўгустувак Артур Малафей**. — У асноўным гэта, безумоўна, матчы паміж самой моладдзю (юнакамі 17—25 гадоў). Але ёсць і адмысловая каманда з Вышэйшай духоўнай семінарыі ў Гродне. Увогуле штогод Слонім збірае каля 100 чалавек: і моладзь, і святары. Звычайна ж такая практыка ёсць у многіх прыходах, дзе па ўзгадненні са школамі святары арганізоўваюць футбольныя матчы ў спартыўных залах.

Як расказаў нам кіраўнік Моладзевага брацтва пры Мінскіх Духоўных Акадэміі і Семінарыі дыякан Сяргей Цімашэнкаў, футбольныя матчы з удзелам святароў арганізоўваюцца таксама і праваслаўнымі вернікамі. Штогод падобныя сустрэчы праводзяцца ў Навагрудскай епархіі і Гродне.

Ілья ЛАПАТО.

ЯК АТРЫМАЦЬ ЧАЯВЫЯ

Выпрабавана на сабе

(НАТАТКІ ФІЗІЯНАМІСТА-ПАЧАТКОЎЦА)

Лета. Здаўшы сесію, распачынаю свой другі працоўны сезон. Каб мець свае грошы, а таксама новы жыццёвы досвед, новыя ўражанні, новыя знаёмствы. Дзякуючы леташняму вопыту працы ў Мінскзелянбудзе, я крышку ведаю, як трэба шукаць, таму прыглядацца да вакансій пачала ўжо ў маі. Калі ў сушукальніка ёсць нейкае ўяўленне ці пажаданне наконт будучай працы, яго пошукі будуць прасцейшымі. Калі вы ведаеце, чаго жадаеце, вы на шляху да поспеху. Але яшчэ важна і тое, дзе шукаць. У інтэрнэце ў асноўным запатрабаваныя спецыялісты з пэўнымі ўменнямі і на пастаянную працу. Дарэчы, мушу заўважыць, што нават праз газету знайсці працу на месяц вельмі і вельмі цяжка. Можна штодзень абрываць тэлефон, ababіваць парогі, запаўняць анкеты па чатыры аркушы кожная — і ўсё безвынікова. Вам будуць ветліва абяцаць ператэлефанаваць праз колькі дзён. Але звычайна за гэтай фразай хаваецца партызанскае маўчанне. У такім выпадку не надта цешце сябе надзеяй. Але, як кажуць, грукайце — і вам адчыняць. Мне проста-такі пашанцавала выпадкова патрапіць на вакансію запраўшчыцы на АЗС. Як і ў першым сезоне, мяне задавальняў той факт, што, каб уладкавацца, дастаткова пашпарта, і ніякіх (!) санкніжак. Аклад абяцалі невялікі, але намякнулі на магчымасць чаявых. У рэшце рэшт, пасля працяглых пошукаў я ўжо была гатова і на голы аклад.

Праца мяне чакала нялёгкая: па дванаццаць гадзін на нагах, дыхаючы бензінам і бясконца ўсміхаючыся розным кліентам. Занятак, які ўключае пастаянныя стасункі з людзьмі, па праву лічыцца адным з самых складаных. Штохвіліны ты атрымліваеш мноства інфармацыі, на якую яшчэ трэба правільна рэагаваць. А людзі ў сваю чаргу лічаць, што трываць хамства — асноўны абавязак абслуговага персаналу, за які, уласна кажучы, яму і плацяць зарплату. Насамрэч, плацяць запраўшчыку за пільнасць, ветлівасць і ўвагу. Праблема АЗС — адарваныя пісталеты. Машыны

ідуць плынямі, людзі спяшаюцца. Натуральна, нехта забывае вярнуць пісталет у калонку. Вось так з ім і ад'язджае. А каб адрамантаваць зламанае, патрабуецца час — вялікая раскоша для буйных АЗС. Запраўшчык жа — твар кампаніі. Таму дысцыпліна тут армейская. Нельга размаўляць па мабільным тэлефоне на працоўным месцы, трымаць рукі ў кішэнях, паварочвацца без неабходнасці спінай да кліента або спрачацца з ім, абапірацца на калонку...

А клиенты бываюць розныя: худыя і поўныя, высокія і маленькія, хмурныя і балбатуны. Але пасля першай скручанай паперкі, што ўпотай была сунута табе ў кішэню, усе разам яны падзяляюцца на шчодрых і сквапных.

АЗС, на якой я працавала, прымала безліч машын. Яны ішлі бясконца, як вада. У першыя ж дні ў мяне з'явіліся працоўныя мазалі ад адстрэльвальнага пісталета. Ногі, нязвыклыя да бясконцай беганіны ад калонкі да калонкі, гулі, быццам па іх праехаў грузавік. Зразумела, можна было б спрасціць сабе задачу і абслугоўваць не ўсіх запар кіроўцаў, а толькі жанчын (як патрабуецца). Такім чынам знізіўся б мой працоўны тэмп. З іншага боку, калі ёсць магчымасць атрымаць больш, чаму б не атрымаць? Тым не менш, дапамагчы кожнаму кліенту фізічна немагчыма. Таму даводзіцца выбіраць, да каго падысці, а каго абмінуць.

Ніколі не здагадаешся, хто дасць

Найперш увага патрэбная найпрыгажэйшай палове чалавецтва. Так пастанавіла начальства і ў прынцыпе мела рацыю. Жанчына за рулём — што фашыст на танку. Паркавацца не ўмее кожная трэцяя.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ДЗЕЛАВЫ СТЫЛЬ — У ШКОЛЬНЫМ СТАТУЦЕ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Патрабаванні да адзення навучэнцаў павінны быць замацаваныя ў статуце і правілах унутранага распарадку агульнаадукацыйнай установы. А кантроль за выкананнем патрабаванняў да знешняга выгляду школьнікаў павінен быць уведзены ў функцыянальныя абавязкі намесніка дырэктара па асноўнай дзейнасці навучальнай установы. Напрыканцы ліпеня Міністэрства адукацыі накіравала ва ўсе абласныя ўпраўленні адукацыі і Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама ліст з пералікам рэкамендаваных мераў, скіраваных на ўвядзенне ў школе адзення дзелавога стылю.

Акрамя вышэйзгаданых мераў у навучальных установах рэкамендуецца правесці канферэнцыі з удзелам навучэнцаў, бацькоў і педагагічных работнікаў, каб абмеркаваць разам пытанні знешняга выгляду школьнікаў і вызначыць камплектнасць адзення для хлопчыкаў і дзяўчатак, а таксама размясціць інфармацыю аб патрабаваннях да знешняга выгляду, уключаючы фатаграфіі ўзораў адзення дзелавога стылю, на інфармацыйных стэндах у агульнаадукацыйных установах. Органам самакіравання навучальнай установы рэкамендавана праводзіць пастаянныя рэйды, каб адсочваць, ці захоўваюць школьнікі дзелавы знешні выгляд.

Трэба патлумачыць, што яшчэ вясной Міністэрства адукацыі накіравала ва ўсе рэгіёны свае тлумачэнні наконт таго, што трэба разумець пад дзелавым стылем адзення: «Дзелавы стыль адзення — гэта строгі вытрыманы стыль, прызначаны для наведвання навучэнцамі вучэбных заняткаў у агульнаадукацыйных установах. Камплект адзення дзелавога стылю павінен быць шматфункцыянальным, гігіенічным, зручным і адпавядаць сучасным напрамкам у модзе. Для хлопчыкаў (юнакоў) у камплект могуць уваходзіць пінжак, камізэлька, штаны, кашуля з кароткімі і доўгімі рукавамі, гальштук. Для дзяўчатак — пінжак, камізэлька, спадніца, штаны, блуза з кароткімі і доўгімі рукавамі, сарафан. У зімовы час у камплекты могуць уваходзіць трыкатажны світар ці камізэлька. Абутак таксама павінен адпавядаць дзелавому стылю адзення». Як тлумачаць у Міністэрстве адукацыі, навучэнцы і іх законныя прадстаўнікі разам з адміністрацыяй установы і педагогамі маюць права выбару мадэлі, колеру і якасці тканін, з якіх пашытае адзенне дзелавога стылю.

Меркаванне Галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Рэспублікі Беларусь Валянціны КАЧАН: *«З майго пункту погляду, як урача-гігіеніста, сёлета «Беллегпрам» ажыццявіў сапраўдны прарыў. Асабліва ў параўнанні з тым, што прапаноўвалася нашым дзецям яшчэ два гады таму. Сёння вытворцы дэманструюць зусім новыя падыходы. Мы бачым не толькі новы дызайн, але і новыя тканіны, новыя колеры. Хачу заўважыць, што для нас самыя важныя паказчыкі — гэта паветрапранікальнасць і гіграскапічнасць, паколькі дзіця вымушана насіць школьнае адзенне працяглы час, і яго цела павінна пры гэтым дыхаць, а тканіны ўсмоктваць вільгаць».*

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАДАРОЖЖА да цэнтра сусвету

Мінатаўр у Кносскім палацы ёсць і цяпер.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Увесь далейшы спуск я адолела з думкамі пра будучы прывал. Ногі ўжо нылі — падэшва летніх кедаў аказалася настолькі тонкай, што кожны каменьчык адчувала ледзь не скурай. Камяні, калі на іх ступаеш, зрушваліся, саслізгвалі, і здавалася, за імі ўніз паедуць мае ногі. Першыя два кіламетры, калі ідзеш на спуск — надзвычай складаныя. Але калі ты ўжо стаіш унізе, сярод камянёў, якія ўтвараюць рэчышча горнай ракі, пазіраеш уверх, то пра гэта зусім не думаеш: перад табой адкрываецца від на магутную гару Гігалас.

Ёсць легенда, згодна з якой Зеўс вяртаўся на Крыт і ўсталёўваў тут свой трон, калі яго стамлялі інтрыгі багоў на Алімпе. А хто ведае, можа менавіта ў цяжкадаступнай Самар'і ён потым хаваў выкрадзеную Еўропу, якая нарадзіла легендарнага цара Мінаса? Па імені сына Зеўса далі назву мінойскай цывілізацыі, самай старажытнай на тэрыторыі кантынента, які названы ў гонар маці Мінаса. А магчыма, гэта была і самая загадкавая цывілізацыя: на Крыце былі знойдзены рэшткі загадкавага Лабірынта (так называлі палац цара Мінаса з вельмі складаным планіроўкай), у якім жыў містычны Мінатаўр. І не такія ўжо байкі — гэтыя паданні і міфы старажытнай Грэцыі, як высветлілася: фрэска быка на развалінах Кносаса выглядае пераканаўча. Як і рэальны трон Мінаса. Копія гэтага трона стаіць цяпер у Гаагскім трыбунале і сімвалізуе гуманнасць еўрапейскага правасуддзя. Мінойская цывілізацыя, напэўна, вылучалася гуманізмам сярод іншых старажытных — тут ніколі не прыносілі ў ахвяру чалавека. Гэтая старажытная цывілізацыя загінула пры загадкавых абставінах, магчыма, з-за прыродных катаклізмаў, аднак трон Мінаса ацалеў падчас пажару, які пагубіў палац і яго насельнікаў. Крыт усё яшчэ тоіць шмат неразгаданых таямніц, над якімі ламаюць галовы гісторыкі ўсяго свету. Чаго толькі варты знакаміты Фесцкі дыск — самае старажытнае пісьмо, знойдзенае на тэрыторыі Еўропы. Сэнс напісанага ніхто не змог разгадаць, можа таму некаторыя смела называюць пасланнем атлантаў.

Сведкам старажытнага жыцця магла быць і чароўная мясцовасць Самарыйскай цясніны. Кажуць, што ў таямнічых гротах і пячорах Самар'і ўсё яшчэ жывуць дэманы і феі. На сцежцы, якая вядзе да гары, сярод груды камянёў бачная арка, якую ўтварылі гіганцкія скалы. Пад ёй знаходзіцца крыніца Лінаселі з празрыстай вадой. Зеўс рэгулярна спускаўся сюды з вяршыні гары, каб выкупацца. За магутным богам, схаваўшыся за скалы, падглядалі цікаўныя німфы... Яшчэ ёсць легенда, якая сцвярджае, што вясковы пастушок грае тут кожны вечар на ліры, а німфы танчаць. Гэтыя легенды спарадзіў шум, які даносіцца з глыбіні пячоры — ты яго сапраўды чуеш, але не можаш зразумець: адкуль ён? Ёсць версія сучасная: магчыма, што гэты шум утвараецца рухам падземных водаў.

Калі ты дайшоў да маляўнічага месца, дзе раптам паміж камянёў струменіцца вада, то ўжо гатовы сам стаць німфай і кінуцца ў яе абдымкі. «Ты еўрапейка», — ледзь стрымліваю сябе, каб не ступіць у раку нагамі. Нас папярэдзілі загадзя: нідзе ў Самар'і нельга купацца, бо вада з горных крыніц настолькі чыстая, што яе п'юць жыхары блізкіх мястэчак.

Усе вёскі, што існавалі на тэрыторыі Самар'і, адсялілі, калі гэтую мясцовасць абвясцілі Нацыянальным паркам. Былыя вёскі цяпер сталі прыстанкамі для турыстаў. Што вельмі да месца пасярэдзіне дарогі, калі ты ўжо не так актыўна глядзіш па баках, а ўсё больш песціш думку пра ўтульную канапу. Цяпер яе замяняе каменны парапет — лаўкі на прывале Аяс-Ніколас аблеплены турыстамі.

БОЛЬШ НЕ МАГУ

Усе сядзяць з абыякавым нерухомым позіркам, толькі ў вачах адбіваецца бездакорна-зіхатлівае неба: сонца ў зеніце, аднак. Адчуваеш: калі зараз не ўстанеш, то не ўстанеш больш ні-ко-лі. Адпачынак можа стаць сапраўднай пасткай: калі перасядзеў, то ногі могуць проста перастаць цябе слухацца, ведаю гэта са свайго юнацкага спартыўнага вопыту. Тым больш, што ў Нацыянальным парку ніхто не дазволіць застацца на начлег: усе, хто зайшоў, павінны выйсці не пазней за 16 гадзін дня. Самі.

Ці з Боскай дапамогай. Вось тут ты асабліва разумееш, што знаходзішся блізка да неба. І не антычныя багі насамрэч даюць табе сілы. Кажуць, што калі нарадзіўся Ісус Хрыстос, Зеўс даведаўся пра гэта і пайшоў на спачынак, і цяпер ён спіць на Крыце. Мясцовыя гіды з задавальненнем паказваюць турыстам гару ля горада Іракліон, якая і сапраўды нагадвае профіль чалавека, які спіць. А на носе яго стаіць маленькая цэркаўка. У гарах Крыта такіх цэркваў шмат. І нават у Самарыйскай цясніне па колішніх вёсак абавязкова было па цэркаўцы. Яны, праўда, такія маленькія — максімум на сям'ю ці на дзве. Убачыўшы крыжык, рушым да яго — дзверы царквы Святога Мікалая адчыненыя. Алтар на месцы, абразы. Крэслы, на якія можна прысесці і памаліцца. У праваслаўнай Грэцыі ў цэрквах дазваляюць сядзець. З дрэс-коду для жанчын — абавязкова закрытыя плечы і калені. Але за табой ніхто не глядзіць. Цішыня нейкая вечная — яна гучыць бласлаўленнем падарожнікам. А яны ў большасці сваёй глядзяць са сцежкі ў бок царквы — і плятуцца міма. Іх, здаецца, не кранаюць ужо ні гіганцкія кіпарысы, самыя старыя ў Еўропе, ні маляўнічы звон. Падняцца да яго — лішніх метраў сто наматаць...

У вёсцы пад назвай Самар'я — такая ж карціна. Назву вёсцы дала царква ў гонар Марыі Егіпецкай, якая была ўзведзена ў 1379 годзе і дажыла да нашых часоў! Тое, што трапіць у горы не вельмі проста, насамрэч ураставала праваслаўную веру на Крыце падчас барацьбы з Венецыяй і ў часы турэцкай акупацыі. А вера сілкавала нацыянальна-вызваленчы рух. І цяпер, калі крыцяне незалежна ад узросту праходзяць каля царквы, то абавязкова спыняцца, паклоняцца і перахрысцяцца. Гэтая царква, падобна, дзейнічае і цяпер — у парку ёсць назіральнікі.

Гэта апошні вялікі прывал перад выхадам з цясніны. Усе групы пераблыталіся. Нашых нікога не бачна, здаецца, што мы апошнія, у самым хвасце. І з зайздрасцю глядзім на немак-нарвежак-англічанак, зусім не маладых, якія бадзёра рушаць далей. Кажам пра гэта нашай правадніцы Яне. Яна смяецца: «Часам прыязджаеш забіраць такіх турыстак у гатэль, глядзіш на іх і разумееш: не дойдзе. Потым пытаешся: «А хто вам параіў гэтае падарожжа?» — «Пляменніца.» — «І шмат вы ёй завяшчалі?..»

Здаецца, нам шанцуе: козы крыкры тут амаль ручныя, за імі не трэба бегаць, каб сфатаграфаваць, хоць кажуць, што яны жывуць на крутых, цяжкадаступных схілах. Але такія крутыя горы нас чакалі напрадзе. Бліжэй да выхаду з цясніны ёсць месца, дзе скалы стаяць ледзь не сцяной. І на адной такой сцяне вельмі-вельмі далёка ўверсе на адвеснай скале мы заўважылі дзве казы — і як толькі залезлі? Кручкі ў іх замест капытоў? Загадка прыроды.

Загадка чалавека: тыя, хто на прывале сядзеў у амаль непрытомным стане, на дарозе раптам ачунялі і гучна зашчоўкалі сваімі фоцікамі. Разумею, што трэба падняць галаву ад дарогі, калі ты скачаш з каменя на камень — і нямею. Здаецца, што скалы падыходзяць бліжэй і бліжэй адна да адной і вось-вось самкнуцца прама над табою. Гэта самая славутая самарыйская брама — шчыліна паміж гарамі ўсяго тры метры. І сапраўды, калі праходзіш пад ёй, ахопліваюць дзіўныя пачуцці. З аднаго боку, жудасна, а з іншага... Разумееш, што выйсце побач.

Пачуццё эйфарыі выносіць да шапіка з кантралёрам: Самарыйская цясніна скароная, ты перамог... І ніхто цябе не сустракае з кветкамі. Мала таго, ты разумееш, што прыйшоў усяго толькі да маленькага паселішча. Маленькія хаткі, ля іх куры, гусі, сабачкі бегаюць. Амаль як у нас, толькі дамкі каменныя. Цэркаўка дагледжаная. Крыж з ручніком. Дарэчы, адкрыццём на Крыце стаў для мяне народны арнамент, вышыты на белым фоне чырвонымі ніткамі — нешта такое роднае, быццам бы нашы далёкія продкі з аднаго катла елі. І хто скажа што не — для розных плямёнаў Еўропа была адзіным домам. Вось і цяперашнія людзі — па-добраму глядзяць табе ўслед. А далей, да ўзбярэжжа яшчэ... пару няўлічаных кіламетраў пад адкрытым сонцам! І больш ніводнай крыніцы. Гэта бесчалавечна...

Апошнія кіламетры прыходзіцца ісці праз «не магу». Але была надзея: тых, хто надта стаміўся і не можа дабрацца да ўзбярэжжа, нібыта за невялікую плату падвозяць на осліках мясцовыя жыхары. Аднак цывілізацыя прыйшла ў горныя паселішчы Крыта і ослікаў замяніў мікрааўтобус. І мы глядзім, як ён ад'язджае, толькі пыл віецца з-пад колаў, і невядома, калі будзе наступны рэйс да Ая-Румелі, дзе нас чакае карабель...

НЕ ВЕДАЕШ, ШТО МОЖАШ

Ад Эгейскага мора мы выйшлі да Лівійскага. Востраў Крыт ляжыць на скрыжаванні трох частак свету: Еўропы, Азіі і Афрыкі. З Еўропы я патраліла бадай што ў Афрыку — яна недзе за гарызонтам, не так і далёка. Мора вабіла насычаным блакітам і абяцала палёгку. У чорным вулканічным пяску пляжа ногі патаналі, кожны метр давайся балюча. Але нехта з тых, хто выйшаў першым, ужо купаўся і крычаў ад шчасця. Скінуўшы рэчы, разумею, што стаю на пякучай чорнай патэльні — кідаюся ў мора... І крычу ад холаду! Лівійскае, хоць і мора ля Афрыкі, але значна халаднейшае за Эгейскае. Што ні кажыце, але тое, што бліжэй да Еўропы, неяк цяплей да цела.

Пару хвілін у моры дапамаглі ачуняць. Седзячы на беразе я назірала, як гэтак жа эмацыянальна віталі сваю перамогу над прыродай іншыя падарожнікі — на самых розных мовах Еўропы. І ўсе глядзелі адзін на аднаго з разуменнем. За гэты шлях я адчула, што спроба лепш пазнаць свой кантынент адкрыла мне сябе самую. Дапамагла зразумець, што чалавек — загартаваная істота, носьбіт самых лепшых рыс, выпрацаваных цывілізацыяй. І мы, беларусы, часам самі не ведаем, што можам. Але кожны з нас носіць у сабе цэлы сусвет і насамрэч можа адкрываць яго бясконца.

Ларыса ЦІМОШЫК.

З ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ «СЛАВЯНКІ» — НА ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ

У Беларусі інтэлектуальныя спаборніцтвы такога ўзроўню пройдуць упершыню.

У Віцебску напрыканцы жніўня (29 — 30) адбудзецца міжнародны турнір па інтэлектуальных гульнях «Славянка». Правельмі высокі ўзровень будучых баталій сведчыць тое, што турнірная камісія «Міжнароднай асацыяцыі клубаў «Што? Дзе? Калі?» надала віцебскаму турніру статус этапа кубка свету (і гэта пры тым, што «Славянка» праводзіцца толькі ў другі раз).

Гэтую навіну арганізатарам літаральна на днях паведаміў вядомы інтэлектуал, магістр гульні «Што? Дзе? Калі?» Максім Паташоў. Ён і іншыя знакамітыя інтэлектуалы возьмуць удзел у гульнях.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **першы сакратар Віцебскай гарадской арганізацыі БРСМ Павел ГАЛАВАЧ**, усяго турнір прыме больш за 40 каманд з Расіі, Украіны, Грузіі, Азербайджана, Малдовы і Беларусі.

Пераможца атрымае пуцёўку на чэмпіянат свету па гульні «Што? Дзе? Калі?», які адбудзецца восенню наступнага года. Знаўцы ў Віцебску адкажуць на пытанні спартыўнай разнавіднасці гульні «Што? Дзе? Калі?». За складанне «пакета» пытанняў адказвае кіеўскі інтэлектуал Канстанцін Навуменка — адзін з самых лепшых інтэлектуальных рэдактараў у свеце.

Турнір арганізуюць грамадскае аб'яднанне «Беларуская ліга інтэлектуальных камандаў» і Віцебская гарадская арганізацыя БРСМ. Гульні пройдуць у актавай зале Віцебскага дзяржаўнага каледжа сувязі.

АДКУЛЬ ЯНЫ, ЭГАІСТЫ?

«Я цябе выгадавала! А ты!.. На электрычцы едзеш...» Усе памятаюць гэтыя словы з мультфільма «Прастаквашына». З эгаізмам мы сутыкаемся часта. Асабліва раняць праявы такой рысы характару ва ўласнай сям'і. Што ж становіцца чыннікам эгаізму і як лягчэй бацькам самастойна заўважыць яго вытокі?

Дзіцячы эгаізм бывае здаровым і нездаровым. Нам жа трэба разабрацца, дзе тая мяжа, што робіць з чалавека эгаіста.

Усе вытокі эгаізму трэба шукаць у сям'і. Калі дзіця пачынае хваліць сябе і выхваляцца — гэта добра. Не варта адразу папракаць яго ў эгаізме. Аднак трэба сачыць, каб дзіцячая хвальба не набыла гіпертрафічных памераў. Час ад часу неабходна нагадваць свайму дзіцяці, што добра быць лепшым, але ёсць і іншыя людзі, якія ўмеюць не менш за яго, а для таго, каб пастаянна падтрымліваць статус лепшага, неабходна працаваць.

Іншая справа, калі вы сваімі рукамі робіце са свайго малога эгаіста. Мы, часам, самі не заўважаем, як аддаём дзіцяці самае лепшае, суправаджаючы свае выказванні рэплікай: «Ды што ты! Гэта ж я для дзіцяці пакінуў (ла)!». Нярэдка мы забываем: малое, што сядзіць у кутку і захоплена гуляе з салдацікамі, успрымае ўсё, што адбываецца побач, а дзеці таксама здольныя рабіць высновы. І хай яны вельмі часта не могуць растлумачыць свае паводзіны і робяць высновы, грунтуючыся на сваім пачуццёвым успрыманні, іх рашэнні, у большасці выпадкаў, лагічныя і выцякаюць з атрыманай інфармацыі. Так што варта задумацца: а ці не здарыцца так, што вы выгадуеце вымагальніка? Бо дзеці растуць, а разам з імі і цацкі.

Галоўная задача бацькоў — выгадаваць адэкватнага чалавека. Не бойцеся размаўляць з дзіцем, як з дарослым, прыводзьце яму прыклады, абмяркоўвайце ўбачанае, папрасіце свайго малога ацаніць прапанаваную вамі сітуацыю. Вы абавязкова здзівіцеся тым высновам, якія робіць ваша дзіця, а можа, заўважыце і праблемы выхавання.

Стасункі адыгрываюць цэнтральную ролю ў фарміраванні асобы. Не бойцеся папрасіць дзіця падказаць вам, як правільна паводзіць сябе ў той або іншай сітуацыі. Яно і адчуе сваю значнасць.

Толькі, калі ласка, не забывайце, што перад вамі больш слабы чалавек, у якога менш вопыту, менш увагі, менш самакантролю. Не папракайце, не зневажайце і не крыўдзіце самага дарагога для вас чалавека. У сваёй стараннасці вы можаце выхаваць не самастойнага чалавека, а ахвяру. Знаходзьце магчымасць за кожны поспех дастаўляць яму маленькую радасць.

І не забывайцеся, што любоў, цярпенне і праца ўсё перамогуць.

Дзмітрый ГУШЧЫНСКІ.

Пазнай свой край

Святы Дух прызямліўся... на Крупшчыне

Гэты раён не багаты на старажытныя помнікі архітэктуры. Аднак «дэфіцыт» шэдэўраў дойлідства з лішкам кампенсуюць амаль не кранутыя чалавекам лясы, унікальныя дрэвы, гаючыя крыніцы. А яшчэ — рэдкія камяні. Прычым шмат хто з мясцовых людзей перакананы: з'явіліся яны тут у выніку незвычайных, неверагодных і нават па-сапраўднаму містычных падзей.

КАЛІ НЕ ВАРТА Ў ЛЕС ХАДЗІЦЬ?

Ад райцэнтра да вёскі Сомры — амаль шэсць дзясяткаў кіламетраў. Найперш гэты край вядомы лясамі і балотамі, вялікімі настолькі, што пасля працяглай непагадзі патрапіць у некаторыя мясціны бывае цяжка. Затое цалкам рэальна заблудзіцца. А напамінкам аб гэтым з'яўляецца... Змееў камень. Знаходзіцца ён на паўднёвым захадзе ад вёскі.

Распавядаюць, што некалі тут, на невялікай выспе сярод балота, жыў Змяіны цар. Дзень ён праводзіў у нары, а штоноч выпаўзаў на паверхню, скручваўся кальцом на чорным камені, высока падымаў галаву з залатой каронай — і ўся выспа асвятлялася незвычайным блакітным ззяннем, гучала чароўная музыка, пачыналася бяседа з удзелам гадзюк, вужоў і мядзянак... Гэтаксама штораніцы Змяіны цар спускаўся ў свой падземны палац пад каменем. Але двойчы ў год, на Благавешчанне і Узвіжанне, Змяіны цар ператвараўся ў прыгожага юнака, ішоў у лес і граў на дудзе — граў так прыгожа, што людзі, як зачараваныя, забыўшыся на хатнія клопаты і сваякоў, цераз гушчары, буралом і балоты ішлі на гукі, вадзілі з «музыкам» карагоды, спявалі, танцавалі, а перад самым захадам сонца знікалі ў бяздонных сховах пад чорным каменем з выявай змяінай галавы.

Пасля ж Дабравешчання і Узвіжання на выспе можна было бачыць самотных людзей, якія ў нізкім паклоне клалі на чорны камень аброк: калі пайшоў у лес і не вярнуўся дадому юнак — тканыя паясы, а калі не вярнулася дзяўчына — пацеркі-каралі. За падарункі Змяіны цар мог аддзячыць — адпусціць сваіх палоннікаў на волю. Але выходзілі яны на паверхню чамусьці вельмі самотныя, задуменныя, бледныя. А пасля вызвалення ператвараліся ў ведзьмакоў або знахараў...

Верыць гэтай показцы ці не, справа, вядома, асабістая. Вось толькі і дагэтуль старыя людзі ў наваколлі Сомраў ніколі не раяць на Дабравешчанне і Узвіжанне хадзіць у лес. На ўсялякі выпадак. Бо няхай сабе «цара» ніхто не бачыў, але Змееў камень — ляжыць і па сёння.

Але ёсць у той жа паўднёва-ўсходняй частцы раёна, на самай мяжы з Магілёўшчынай, і каменьабярэг. Ці Князеў камень. Лічыцца, што некалі на гэтым сіняватым валуне любіў сядзець тутэйшы адважны, мудры і прыгожы князь, які такім чынам «браў» з каменя сілу і маладосць. Князь загінуў падчас адной з боек, але яго душа па сёння лятае тут — вартуе наваколле ад ворагаў.

НА ВЯЛІКДЗЕНЬ — НЕ ПАЛІЮ

У вёсцы Знаменка — свой рарытэт. Тут можна пабачыць магутны, падобны на мядзведзя валун. А літаральна за сотню метраў ад яго ляжаць яшчэ некалькі камянёў. Гэта — «Паляўнічы з сабакамі».

Наконт незвычайнага «каскада» ёсць легенда. Аднойчы жыхар вёскі выправіўся на Вялікдзень з сабакамі на паляванне, і трэба ж такому здарыцца — амаль адразу пашчасціла патрапіць на магутнага мядзведзя. Паляўнічы схаваўся за сасну, падпусціў драпежніка бліжэй і дакладна стрэліў. Звер упаў. Аднак у той самы момант на ясным небе, на якім была толькі невялічкая хмарка, раптам бліснула маланка і ўдарыў пярун — і мядзведзь, і паляўнічы, і сабакі ператварыліся ў каменне.

Адсюль і навука-напамін: на Вялікдзень не працуй, не палюй, нават не рві аніякай расліны. А хто парушыць гэты закон — будзе пакараны.

КАМЕНЬ ЖАДАННЯЎ

Каля вёсак Стараселле, Старожышча, Куплінка можна адшукаць «Божыя слядкі» — камяні з адбіткамі нагі. Ёсць меркаванне, што гэтыя камяні з'яўляюцца ні чым іншым, як сведчаннем вандроўкі па Беларусі Ісуса Хрыста. І ўсё ж галоўная хрысціянская святыня іншая — валун у форме крэсла. Ці «Божага крэсла».

— Занатавана такое паданне, — распавядае мясцовы краязнавец Міхаіл Адамавіч Баравуля. — У старыя часы насельніцтва вёскі Сомры падзялялася на язычнікаў і хрысціян, першыя маліліся сваім багам за ракой Самранка, а другія — зрабілі каплічку на возеры. Гэта не спадабалася язычнікам, якія вырашылі каплічку знішчыць і паставіць на яе месцы ідала. Даведаліся аб гэтым хрысціяне, і сабраліся, каб абараніць святыню. Але і язычнікі не збіраліся здавацца: так і сталі — нібыта сцяна на сцяну. Але калі, здавалася б, да вялікай бойкі заставаліся хвіліны, здараўся цуд. На ясным небе з'явілася воблака, што пералівалася ўсімі колерамі вясёлкі і паволі апускалася на месца, дзе пры дарозе на ўваходзе ў капліцу ляжаў вялікі круглы валун. Калі ж воблака рассеялася, усе ўбачылі, што на камені, які нечакана прыняў форму крэсла, сядзіць чалавек у белай світцы з доўгімі валасамі і пільна ўглядаецца ў натоўп. А потым чалавек прамовіў: людзі, хто верыць у Ісуса Хрыста, падыдзіце да мяне — я вас абараню. Людзі хрысціянскай веры рушылі да Святога Духа — гэта быў менавіта ён. Раптам на небе з'явілася чорная хмара, бліснула маланка, ударыў пярун — і драўляны ідал загарэўся, а самі язычнікі пачалі ператварацца ў драўляныя чурбакі і маленькія камяні. Тады Святы Дух перахрысціў усіх, устаў і паволі пайшоў па лузе да возера. Тут зноў з'явілася ззяючае воблака, якое стала падымацца ўверх і знікла ў блакіце светлага вясновага дня. Знік і Святы Дух. Але яго каменнае крэсла — засталося.

Некалькі гадоў Божае крэсла з дазволу царквы вырашылі перавезці з глухіх Самрацкіх лясоў у Крупкі — сёння пабачыць гэты ўнікальны камень можна перад рэнавацыяй гісторыка-краязнаўчым музеем. У выніку, адзначае старшы навуковы супрацоўнік музея Святлана Домненка, у крупчан з'явілася новая традыцыя — лічыцца, што простага дотыку дастаткова для здзяйснення любога жадання. А тым больш падыходзяць да Божага крэсла бабулі, што прыязджаюць з паўднёвай самрацка-ўхвальскай зоны. І няхай сабе дакладных звестак аб тым, што такім чынам можна пазбавіцца ад хваробаў, няма. Затое ёсць пераканне: камяні «нараджаюцца» з зямлі. А мы бяром з зямлі сілу.

Сяргей ГРЫБ. Фота аўтара.

Крупскі раён.

ВОДНАЕ ВЯСКОВАЕ МОЛАДЗЕВАЕ СВЯТА, або Фрыстайл на матрацах, бег на хадулях...

У Віцебскім раёне ў вёсцы Герасімава на прыгожым беразе возера Лосвіда праходзіць адкрыты воднаспартыўны фестываль моладзі, у якім бяруць удзел больш за 400 хлопцаў і дзяўчат з розных раёнаў Прыдзвінскага краю.

Як паведамілі нам у аддзеле па справах моладзі і абарона-мабілізацыйнай рабоце Віцебскага гарвыканкама, сярод іншых праводзяцца конкурсы роспісу па целе (з абаронай мадэляў у музычным суправаджэнні), кулінараў, рыбаловаў. Члены камандаў дэманструюць уменне распальваць вогнішча, раскладваць палатку і гэтак далей.

Вельмі насычаная і спартыўная праграма фестывалю. Моладзь бярэ ўдзел у фрыстайле на... матрацах, бегае на хадулях, перацягвае канат. Пераможцы спаборніцтваў атрымаюць памятныя прызы. Фестываль прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЯК АТРЫМАЦЬ ЧАЯВЫЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Звычайная для іх рэч: тэлефанаваць мужу, каб высветліць, з якога боку ў машыне бак, а потым разам з запраўшчыкам шукаць у салоне тую самую кнопачку, каб яго адчыніць. Але пры ўсім гэтым ім не бракуе пачуцця ўласнай годнасці. Вось толькі запраўка трапілася нязручная, каб пад'ехаць да калонкі, або інструктар не даў тэорыі на ўсе выпадкі жыцця. З кім не здараецца... Таму стэрэатып, што жанчына — дрэнны кіроўца, небеспадстаўны. Пакідаю злосных феміністак і далучаюся да мужчын. Тым больш, што чаявыя прыгажуні даюць вельмі рэдка.

Увогуле ж, ніколі не здагадаешся, хто дасць. Нават наадварот — хуткасцю ўважаць тыя, ад каго не чакаеш. Пэўна, каб прасачыць нейкую тэндэнцыю, трэба прастаяць на тым астраўку не месяц, а, можа, год. І тое не факт, што тады давядзецца спасцігнуць загадку чалавечай душы.

Праз мае рукі праходзілі Jaguar, Infinity, Lexus і Волгі, Жыгулі, Ікы. Ні ад тых, ні ад другіх не варта чакаць міласціны. Як і ў прыродзе, крайнасці не вітаюцца. Хаця мне давалі раз з «капейкі» і Opel Kadett, але гэта ўсё ж выключэнне.

Партрэт ідэальнага кліента

Найлепшы кліент — мужчына на машыне сярэдняга класа, пажадана не надта малады. Вядома, сустракаюцца людзі прыстойныя і з простымі машынамі і па-чалавечы дзякуюць за паслугу. Або не надта прыстойныя, але якія жадаюць адчуць сябе панам, якога абслугоўваюць. Такія даюць, каб фарсануць. Іншыя ж з армейскай хуткасцю выскокваюць з машыны і з крыкам «не трэба, я сам» амаль з рук у запраўшчыка выхопліваюць пісталет. Сам дык сам. І ўсё ж гэта хлеб, — не цэняць працу. Менавіта таму кліент павінен быць прадстаўніком вышэйшага сегмету сярэдняга класа. Няхай сабе касцюм з іголачкі і машына блішчыць — у гэтага заўсёды водзіцца дробязь на чай, з якой ён не шкадуе развітацца, бо сам у студэнцкія гады грузіў вагоны. Яшчэ адна вартасць сталага ўзросту — сумесь бацькоўскай мужчынскай любові да дзетачкі-запраўшчыцы. Адзін зухаваты дзядок на мой камплімент наконт ягонага шыкоўнага аўтамабіля адказаў: «Не люблю старыя машыны, як і старых жанчын», — і сунуў мне жменю цукерак.

Стэрэатыпы ўсё ж працюць

Але нават калі кліент падыходзіць пад апісанне, гэта яшчэ не гарантуе прыемны звон у вашай кішэні. Ёсць шмат іншых акалічнасцяў, якія трэба ўлічваць. Напрыклад, знешнасць і стаўленне да рэчаў. Калі гаспадар ужо падрыхтаваў грошы за паліва, можна дакладна сказаць, ці перападзе з гэтага што-небудзь запраўшчыку. Так, калі кліент ахайна складае паперку да паперкі з гладкімі вугалкамі, можна да яго нават не падыходзіць. Калі ж які з іх вымае жменю грошай з кішэні (яшчэ лепш — з розных), гэта ваш кліент. Хоць колькі, але такі абавязкова дасць чаявыя.

Але калі не давялося ўгледзець партманэ кіроўцы, сачыце за яго машынай. Дакладней, як ён абыходзіцца са сваёй «ластаўкай». Вядома, што для многіх мужчын машына — усё адно што член сям'і. Маючы ўласнага «пітомца», я выдатна разумею іх пачуцці і, натуральна, ухваляю ўсялякія клопаты наконт здароўя рухавіка, утульнасці салона і чысціні «кармы». Але! Калі на вылізаным да бляску кузаве, у які можна глядзецца, бы ў люстэрка, гаспадар заўважае нейкі развод і, скрывіўшыся, пальчыкам яго выцірае, пэўна, вам ад яго нічога не дастанецца. Таксама ўцякайце ад мужчын, што з агідай бяруць сурвэтку і так манерна, адставіўшы мезенец, вымаюць пісталет. Ад гэтых зануд, акрамя адвечнай незадаволенасці невядома чым, нічога больш не атрымаць. А навошта псаваць сабе настрой? Я ж мушу ўсміхацца.

Заправіць кліента не толькі палівам, але і добрым настроем

Калі характар — рэч нажыўная, то настрой паддаецца лячэнню. Часам менавіта запраўшчык у сілах выправіць сітуацыю. Бывае, прыязджае да калонкі які кліент не ў гуморы, зірне на запраўшчыцу — усміхнецца скупа, а напрыканцы запраўкі ўжо сам жартуе і смяецца. Так, чалавек больш схільны рабіць дабро, калі ў самога яго ўсё добра. А каб ён даў вам чаявыя, вам трэба яму спадабацца. Шлях да сэрца любога кіроўцы ляжыць праз ягоную машыну: вочы напаўняюцца пяшчотай, на твары з'яўляецца салодкая ўсмешка і ён ужо лічыць вас сваім аднадумцам. Але каб раскруціць кліента, для запраўшчыка вельмі важна не столькі разбірацца ў машынах, колькі быць чулым і цярплівым. Нехта вязе цешчу на мора, нехта сам едзе на рыбалку — раздзяліце з чалавекам ягоную радасць. Хтосьці пацёр у ДТЗ бампер свайго Лэнд-крузера на 300 долараў — паспачувайце яму, хтосьці спазняецца на працу — дапамажыце хутчэй заправіцца. А некаму трэба проста выказацца пра лёс свой мудрагелісты і пра дачушку-разумніцу за акіянам... Затое і самой потым прыемна, калі які пастаянны кліент прызнаецца, што прыязджае менавіта да вашага астраўка або ўжо здалёк вітаецца з вамі, як з сябрам. «Вы памятаеце мяне? Я — той, на Таёце, што без корка ад бака». А ў мяне такіх Таёт не адзін дзясятак за дзень праходзіць. Але яго, як ні дзіўна, памятаю.

Шчыра радавацца кожнаму кліенту

Але ніколі не трэба адчайвацца. Па абавязку службы я ветліва шчабятала і ўсміхалася ўсім. А каб выглядаць натуральна, трэба, як таму акцёру, самому верыць у тое, што гаворыш і робіш. Праўду кажуць псіхолагі: нельга быць шчаслівым, калі хмурышся, і цяжэй сумаваць, калі смяешся. І рана ці позна вашы намаганні будуць адзначаны. Калі — марожаным, а калі і капейчынай. Але звычайна калі і даюць, то тую дробязь, што ёсць у кашальку, каб месца шмат не займала: хто дасць 500 рублёў, а нехта не пашкадуе і 1,5 тысячы. За дзень набягае да 15 тысяч, а за 15 рабочых дзён у месяц —падлічыце колькі... Ды і камплімент кіроўцы не шкадуюць. Я за ўсё жыццё іх столькі не чула, колькі за адзін месяц. І раней, бадай, не ўсміхалася столькі. А прапановы наконт працы проста пасыпаліся: у кавярню, друкарню, нават на будоўлю. І зарплату абяцалі большую. Эх, дзе ж вы былі, калі я цэлымі днямі гартала аб'явы аб працаўладкаванні?

Так, на запраўку прыязджаюць і спевакі , і бізнэсмены, і рабочыя. Усе такія рознымя, кожны са сваімі «тараканамі». І ты мусіш прымаць іх такімі, якія яны ёсць.

Але нягледзячы на цяжкасці працы і недаскан

ПАСЛЯ ПОДЗВІГУ

Чырвоным радком праз усю гісторыю дзейнасці Мінскага антыфашысцкага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны праходзіць правядзенне трох знакамітых аперацый: выданне летам 1942 г. у Мінску падпольнай газеты «Звязда»; замах у верасні 1943 г. на нямецкага гаўляйтара В. Кубэ, зрыў нямецкіх планаў па замініраванні і разбурэнні горада напярэдадні прыходу Чырвонай Арміі. Сярод названых падзей найбольш слаба распрацаванай застаецца першая тэма. Іменна ёй па гэтай прычыне прысвячаецца гэты артыкул. Яго аснову складаюць архіўныя матэрыялы, здабытыя ў апошні час пасля рэабілітацыі сакратара Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б І.К. Кавалёва з 10.1941 па 10.1942 г. (Амаль 50 гадоў незаконна абвінавачваўся ў здрадзе, супрацоўніцтве з акупантамі.)

Не поўнасцю вывучаны вобраз галоўнага арганізатара падпольнай «Звязды», яе першага рэдактара У.С. Амельянюка. Ён, як сведчаць успаміны яго маці, Паўліны Сцяпанаўны, нарадзіўся ў 1917 г. на станцыі Дно Пскоўскай губерні. У гады Першай сусветнай вайны, ратуючыся ад войскаў кайзераўскай Германіі, сям'я пераехала ў Беларусь. Тут Уладзімір Амельянюк закончыў педагагічныя курсы, працаваў настаўнікам, рэдактарам раённай газеты. Вялікую Айчынную сустрэў у Брэсце, дзе ў рэдакцыі абласной газеты праходзіў практыку як студэнт Камуністычага Інстытута журналістыкі ў Мінску. Уладзімір быў жанаты, меў дзіця-хлапчука, якому напярэдадні вайны споўнілася каля 3 гадоў. Куды дзелася жонка, невядома. Лёс дзіцяці таксама не вызначаны. Ваенная суседка, жонка актыўнага мінскага падпольшчыка С.І. Зайца, Вера Паўлаўна, ва ўспамінах (1983) піша: «Амельянюк Уладзімір быў вельмі добрым, талковым, маладым чалавекам, сумленным, прыстойным, знешне цікавым. У сапраўднасці ён быў цікавейшы, чым выглядае на фотакартцы, якую вывешваюць на плошчы Перамогі ў дні святкаванняў».

У.С. Амельянюк з ліпеня 1941-га па дзень сваёй трагічнай канчыны з'яўляўся членам падпольнай групы на Камароўцы. Апошняя, будучы мінскай ускраінай, мела цесную сувязь з жыхарамі навакольных вёсак. Камароўка паступова аб'яднала ў сваім складзе не толькі мінчан, але і падпольшчыкаў Мінскага, Дзяржынскага, Заслаўскага, Лагойскага раёнаў. Даверлівыя адносіны з Амельянюком мелі А.В. Каліноўскі, Г.В. Будай, П.М. Хмялеўскі, І.М. Цімчук і іншыя прадстаўнікі названых раёнаў. Усё пачалося з выпуску лістовак. Ужо восенню 1941 г. па даручэнні члена Мінскага падпольнага ГК КП(б)Б С.І. Зайца Амельянюк напісаў лістоўку-зварот да сялян-калгаснікаў, у снежні 1941 — студзені 1942 г. з-пад яго пяра выйшлі матэрыялы («Вестник Родины»), прысвечаныя контрнаступленню Чырвонай Арміі пад Масквою. Яму больш чым каму належыць і выданне серыі лістовак пад назваю «Патриот Родины», якія доўгі час з-за цеснай сувязі Амельянюка з Кавалёвым прыпісваліся групе А.А. Маркевіча. Адно толькі супастаўленне гэтага выдання з газетай «Звязда» паказвае, што гэтыя работы зроблены адной асобай — Амельянюком. У канцы 1941 — пачатку 1942 г. у Мінску дзейнічалі падпольныя друкарні на кватэры бацькі і сына М.П. і М.М. Воранавых, В.В. Захарэвіча, М.Б. Чыпчына, Х.М. Александровіча. Усе яны, з пункту гледжання друкарскіх магчымасцяў (запасаў паперы, шрыфту, колькасці радыёпрыёмнікаў), сувязных, літаратурных супрацоўнікаў), былі рознымі, але аднолькавымі ў сэнсе адзінага кіраўніка, якім з'яўляўся падпольны гаркам партыі на чале з Кавалёвым.

Дзе ж выйшаў першы нумар падпольнай «Звязды»? У афіцыйнай літаратуры называецца ў якасці такога месца вул. Шорная, 9. У сапраўднасці, як устаноўлена дадатковым аналізам, нумар убачыў свет на вул. Шорная, 13, кв. 1. Іменна тут пражывала сям'я Воранавых, якія 21.05.1942 г. звярсталі і надрукавалі першы нумар «Звязды» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 4386, вопіс 1, справа 24, ліст 14; там жа, ф. 4п, в. 2, спр. 1299, л. 94). Родны брат М.П. Воранава Макар Паўлавіч ва ўспамінах ад 23.02.1953 г. сведчыць: «Воранаў Міхаіл са сваім сынам падтрымліваў сувязь з Мінскім падпольным гаркамам партыі. У іх кватэры быў выпушчаны 1-ы нумар беларускай газеты «Звязда», друкаваліся лістоўкі, пропускі і іншая падпольная літаратура». Макар Паўлавіч дапамагаў брату Міхаілу пераносіць шрыфт з нямецкай друкарні газеты «Мінскер Цайтунг», хаваць яго, вартаваў кватэру, калі там друкаваліся падпольныя дакументы. З яго слоў, Воранаў Міхаіл арыштаваны дома, а яго сын у нямецкай друкарні. Абодва загінулі ў Трасцянцы.

Пасля гібелі Амельянюка ўбачылі свет яшчэ 3 нумары «Звязды», друкаваў іх ураджэнец горада Мінска, выпускнік Камуністычнага Інстытута журналістыкі, напярэдадні вайны — намеснік дырэктара Дзяржвыдавецтва БССР Хасан Мустафавіч Александровіч. Іх адрасамі былі: вул. Выдавецкая, 10 (2 і 3 нумары), вул. Трэцяя лінія, 26 (4-ы нумар). Александровічу належыць выданне 18.10.1942 г., у самы разгар арыштаў, антыфашысцкай лістоўкі «Да насельніцтва Беларусі», якая заклікала жыхароў Мінска да бескампраміснай барацьбы з акупантамі і з іх правакатарамі. Пасля Амельянюка функцыі рэдактара выконвала Я.М. Савіцкая. Ёй было значна лягчэй: падпольны гаркам КП(б)Б (Кавалёў, В.К. Нікіфараў, М.А. Шугаеў) узяў на сябе значную частку рэдактарскай работы. Улічваючы гэта, нам здаецца, што да рэдактараў падпольнай «Звязды» (Амельянюка і Савіцкай) можна было б дадаць В.К. Нікіфарава і У.С. Казачонка, якія поўнасцю адпавядаюць названым патрабаванням. Газета мела і літаратурную частку. Яе задачы ў 1-м нумары поўнасцю выконваў Амельянюк, дапамагала А.Я. Цітовіч, у 2-м, 3-м, 4-м — Савіцкая, Казачонак, Рынкевіч, А.А. Карпусенка.

Імя У.С. Амельянюка цесна звязана з утварэннем вакол Мінска шэрагу партызанскіх атрадаў. Кандыдаты ў гэтыя патрыятычныя фарміраванні адбіраліся і рыхтаваліся ва ўмовах глыбокай канспірацыі і на працягу некалькіх тыдняў. Адзін з іх жыхар Сталінграда, былы савецкі ваеннапалонны, падчас вайны камандзір партызанскай брыгады А.Ф. Сакалоў прыслаў у 1960 г. у Мінск ліст з мноствам падзяк у адрас членаў Камароўскай падпольнай групы, у тым ліку і Амельянюка. Але пасланне нечакана заканчваецца наступнымі мінорнымі разважаннямі: «Чаму толькі зараз паўстае пытанне аб вывучэнні Мінскага падполля? Ці не значыць гэта, што ім ніхто не цікавіцца? А можа тут крыецца нейкая іншая прычына: адразу пасля заканчэння вайны на ролю «арганізатараў» падполля і наогул усяго партызанскага руху ў Беларусі стала прэтэндаваць мноства людзей, якія ў час ваенных дзеянняў нічым не выдзяліся. Гэта стварала адпаведныя цяжкасці ў вызначэнні сапраўдных арганізатараў. Магчыма, гэтым тлумачыцца тое, што Беларусь, у якой у 1944 г. пры злучэнні з наступальнымі часцямі Чырвонай Арміі налічвалася да 400 000 партызан, — мае толькі адну мастацкую кінастужку, прысвечаную патрыёту Канстанціну Заслонаву, што ў гэтай арміі партызан не маецца ніводнага двойчы Героя Савецкага Саюза і наогул мала герояў, а тым болей з ліку тых, хто пачынаў гэту свяшчэнную барацьбу».

Вялікая і шматгранная патрыятычная дзейнасць Уладзіміра Сцяпанавіча Амельянюка закончылася трагічна 26 мая 1942 г. У той дзень ён загінуў у цэнтры Мінска ў выніку перастрэлкі з агентамі нямецкай тайнай паліцыі. Дата і месца гібелі Амельянюка пацвярджаецца дакладнымі дакументамі ваеннага часу. Але толькі ў 1965 г., пасля двухгадовай працы спецыяльнай камісіі па гісторыі Мінскага антыфашысцкага падполля, У.С. Амельянюк і яшчэ чатыры ўдзельнікі мінскага патрыятычнага руху ўдастоены высокага гаранаровага звання Героя Савецкага Саюза.

1977 год — пачатак дзвюх эпох у жыцці горада. Была тады забіта першая паля ў будаўніцтве Мінскага метрапалітэна, на дзяржаўным і палітычным узроўнях зацверджаны план мемарыялізацыі Мінскага партыйнага падполля. Амельянюк стаў першым падпольшчыкам, якому прысвячаўся спецыяльны мемарыяльны знак. Да вырашэння гэтых задач далучылася група гісторыкаў з ліку навукоўцаў Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, партархіва, Інстытута гісторыі АН БССР, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Паўторнае вызначэнне месца гібелі У.С. Амельянюка праходзіла з удзелам былых падпольшчыкаў, якія ўваходзілі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў склад Камароўскай падпольнай групы, былі сведкамі гераічных падзей. У якасці такіх выступілі: Г.В. Будай, П.М. Хмялеўскі, М.Б. Осіпава, В.Ф. Мацюшка, Я.М. Савіцкая і інш. Скульптурнае і архітэктурнае ўвасабленне ідэі ўвекавечання было даверана аўтарскаму калектыву ў складзе скульптара, народнага мастака БССР Анатоля Анікейчыка, архітэктараў, лаўрэатаў Ленінскай прэміі Юрыя Градава і Леаніда Левіна. У бягучай рабоце дапамагаў архітэктар Віктар Барташэвіч.

У вялікае гарадское свята вылілася адкрыццё 24 верасня 1980 года мемарыяльнага помніка першаму рэдактару падпольнай «Звязды» У.С. Амельянюку і яго баявым таварышам. Плошчу перад Домам Урада запоўніла галоўным чынам моладзь: навучэнцы школ, гарадскіх прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, тэхнікумаў, ВНУ, курсанты ваенных навучальных установ, спартсмены, прадстаўнікі моладзі Брэста, Магілёва, Віцебска, Гомеля, Барысава, іншых гарадоў, дзе ў гады вайны існавала антыфашысцкае падполле. Упершыню свята было падзелена на дзве часткі: на мітынг ля помніка і ўрачыстае шэсце перад цэнтральнай трыбунай насупраць Дома Урада. Мітынг адкрылі кіраўнікі беларускай сталіцы Г.С. Таразевіч і Г.Г. Барташэвіч. Павольна спадае пакрывала. І перад прысутнымі паўстае вобраз заціснутага з усіх бакоў патаемнага пакоя, дзе толькі што нарадзілася легендарная падпольная «Звязда». Ля мемарыяльнага знака становіцца ганаровая вахта. Цэнтр свята паступова пераносіцца да цэнтральнай трыбуны, на якую падымаюцца вядомыя ў краіне дзяржаўныя і грамадскія дзеячы П.М. Машэраў, А.Н. Аксёнаў, У.І. Бровікаў, А.Т. Кузьмін, І.Ф. Якушаў, У.Е. Лабанок, ганаровыя госці. Адзін з іх былы камандуючы Першым Прыбалтыйскім фронтам, актыўны ўдзельнік вызвалення Беларусі і Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Маршал Савецкага Саюза І.Х. Баграмян, звяртаючыся да моладзі, сказаў: «Захаваць неацэнны набытак нашага народа — памяць — памяць аб загінулых, аднавіць імёны герояў вайны, выявіць акалічнасці подзвігу — што можа быць важнейшым?».

Марш наследнікаў герояў

[Окончание. Начало на 1-й стр.].

мы уступаем на пепел. Ленина и быстройшую-упрядь Дома юнг. Тут у фашистской оккупацией во-жуях магнала одного з ...ной юнгской подполья ...ов Советского Союза Ура-...а Аменьянюка. Ён быў ...ым журналістам і ўна-...артыйным арганізатарам. ...овах жорсткага тэрору, ...ают найменшая падаз-...ў «нелаяльнасці» да ...ага завяршаюся рас-...ка, ён нікадзіў з дапа-...і верных людзей выпуск ...ы «Звязда», са старонак ...учаў паланыны закліч ...ці да барацьбы з фашы-...

...ось цэлую на месцы гібелі ...я ўдзячны пакланяцца па-...ў увекаснены мемарыяль-...нак. Строгі каменны мана-...ружыны чорнай гранітнай ...а з выбітымі на ёй кур-...рагамі з кампозіцыі ...ага гэтай сцэнай-кампазіцыі ...ашысцкай кнігі. Але ...ахаваць народ-нака-...ці здольны цэнтр свабоды і ...ці, і, як сцвярджаюць ...ветчыкі, ручаюся да людзей ...ацэсу гэтага ...

У час адкрыцця мемарыяльнага знака Герою Савецкага Саюза Уладзіміру Амельянюку.

Фота М. Амельянюк.

...мінскага падполля В. Ф. Ма-...ецкага і рэдактар газеты «Зна-...ня юнастаў» М. П. Карповіч, ...Юнарайёну (другі ўдзельні-...ацкага мітынгу ...

...навы на кнізе) ў гісторыю, а ...прадаўжаюць і ...ырашаюць ...ў новых гра-...ных здзейсненняў ...будучы ...

...мой сацыялістычнай Айчыны. ...Дарагія юныя сябры ...Расцце барацьбітамі за мір-...нучую справу Уладзіміра ...Ленінга, Камуністычнай ...

...ніцтва вынік больш адказ-...насцю за працэс гераічнай ...традыцый старэйшых пакаген-...ый. ...Сцвердзіць б сказа-...

...мі. Удзельнікі эстафеты пабы-...вання ў месцах, звязаных з ...дзейнасцю У. І. Ле-...ніна, у гарадах-героях, сталіцах ...

Словы маршала дазваляюць засяродзіць увагу на наступным. Да грамадства дайшлі чуткі аб магчымасці пераносу, у сувязі з рэканструкцыяй плошчы Незалежнасці, помніка Амельянюку на новае месца. Безумоўна, нічога ў свеце не бывае вечным. Гэта датычыцца і абеліска. Але імкнуцца да пастаяннага як часткі духоўнага неабходна. Таму аўтар гэтых радкоў як чалавек, які аддаў болей за 20 гадоў вывучэнню гісторыі Мінскага падполля, звяртаецца да кіраўніком горада з просьбай разгледзець мноства варыянтаў дзеля захавання мемарыяльнага знака Амельянюку і яго таварышам на тым месцы, дзе яго паставіла сама гісторыя.

Яўген БАРАНОЎСКІ,
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт.

Пытальнік

«БАЦЬКА ПРАПАЎ БЕЗ ВЕСТАК У ЖНІЎНІ 1944-ГА...»

Паважаная рэдакцыя, звяртаецца да вас ваш падпісчык з просьбай. Дапамажыце адшукаць месца пахавання майго бацькі Аляксандра Дзмітрыевіча Мешчаракова. Год яго нараджэння — 1906-ы. Мне толькі вядома, што ён прапаў без вестак у жніўні 1944 года. Справа захоўваецца ў Талачынскім райваенкамаце з датай ад 18 чэрвеня 1947 года. Калі будуць патрэбныя якія іншыя звесткі, можна звяртацца да мяне, я жыву ў бальніцы ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання. Я інвалід II групы па зроку. Пісаць сам не магу.

Дзмітрый Аляксандравіч МЕШЧАРАКОЎ,
г.п. Коханава Талачынскага раёна.

Відавочна, папрасіць напісаць гэты ліст нашага прыхільніка падштурхнуў апублікаваны некалькі раней аналагічны запыт ад вясковай жанчыны, што шукала месцы пахаванняў родных людзей, якія загінулі ў вайну. Аднак тады мы валодалі куды большым аб'ёмам інфармацыі. А ў гэтым выпадку, як высветліў па нашай просьбе ў Дзмітрыя Аляксандравіча **намеснік ваеннага камісара Талачынскага раёна начальнік мабілізацыйнага аддзялення маёр Вячаслаў БЕЛЫ,** ніякіх іншых звестак у заяўніка не было. Не захавалася ні лістоў ад бацькі з фронту, ні фотаздымкаў. Адпаведна, невядомы ні нумар вайсковай часці, дзе ён служыў, ні род войскаў, ні воінскае званне і пасада. Гэтыя звесткі з'яўляюцца абавязковымі пры пошуках і чым іх больш, тым болей шанцаў адшукаць сярод архіўных звестак інфармацыю пра канкрэтнага чалавека. Невядома нават, дзе бацька Дзмітрыя Аляксандравіча прапаў без вестак, на якой тэрыторыі — у Беларусі ці, скажам, ужо ў Польшчы. У першым выпадку можна было б паспрабаваць распачаць пошукі ў канкрэтным раёне. Калі б гаворка вялася пра замежжа, іх алгарытм быў бы некалькі іншым.

Як патлумачыў далей Вячаслаў Сцяпанавіч, заяўнік звяртаўся ў ваенкамат недзе за месяц да ліста ў рэдакцыю. І ўсе вышэйагучаныя звесткі атрымаў менавіта тут, больш ніякіх звестак у ваенным камісарыяце не захавалася. Можна было б параіць яму паспрабаваць звярнуцца ў архіў у расійскім горадзе Падольску, аднак, як мы ўжо адзначылі, каб пошукі былі паспяховымі, патрэбна хоць нейкая дакладная інфармацыя...

Парушэнняў пры спыненні працоўных адносінаў няма

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«Я працую ў буйной сталічнай кампаніі, звязанай з будаўнічымі матэрыяламі і паслугамі. Дакладней, працаваў. Сёлета ў ліпені я пайшоў у чарговы працоўны водпуск. Скончыцца ён павінен быў літаральна ў апошнія дні дзеяння майго кантракта. За два тыдні да заканчэння водпуску і ўласна кантракта, я па пошце атрымаў ад кіраўніцтва кампаніі ліст пра тое, што надалей кантракт са мной не працягнуты. Я недзе чуў, што тэрмін, за які наймальнік павінен папярэдзіць работніка аб падаўжэнні або непадаўжэнні кантракта, павінен быць большым, чым два тыдні. І чаму такое папярэджанне я атрымаў праз пошту? Тут няма ніякіх парушэнняў заканадаўства?» З такімі пытаннямі ў рэдакцыю звярнуўся малады чалавек, які па зразумелых прычынах прасіў не называць яго прозвішча. «Літаральна напрыканцы водпуску я крыху захварэў, цяпер у мяне на некалькі дзён — бальнічны ліст, таму да кіраўніцтва на працу паеду крыху пазней».

Мусім адразу расчараваць нашага заяўніка — ніякіх парушэнняў з боку наймальніка няма. Ці варта маладому чалавеку звяртацца з гэтай нагоды ў суд, як ён пытаўся ў нас далей? Тут можна прыгадаць пастанову пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь № 4 ад 26 чэрвеня 2008 года «Аб практыцы разгляду судамі працоўных спрэчак, звязаных з кантрактнай формай найму работнікаў». У прыватнасці, яе пункт 12, дзе гаворыцца, што «бакі, якія заключылі кантракт, не пазней чым за два тыдні да заканчэння тэрміну яго дзеяння, калі большы тэрмін не прадугледжаны кантрактам ці іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі, пісьмова папярэджваюць аб сваіх намерах у частцы яго падаўжэння ці спынення працоўных адносінаў. Незахаванне гэтай умовы можа прызнавацца судом як парушэнне вызначанага парадку звальнення з працы, якое не цягне аднаўлення на працы, але можа з'яўляцца падставай для вынясення судом рашэння аб пакрыцці маральнага ўрону (артыкул 246 Працоўнага кодэкса), калі такое патрабаванне заяўлена».

Калі гаварыць пра спосаб, праз які малады чалавек даведаўся, што з ім не падоўжылі кантракт, дык тут можна прыгадаць Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 180 ад 12 красавіка 2000 года. У ім, у прыватнасці, гаворыцца (пункт 1, заўвага, абзац 3), што «кожны з бакоў, што заключылі кантракт, не пазней чым за два тыдні да заканчэння тэрміну яго дзеяння пісьмова папярэджваюць другі бок аб рашэнні падоўжыць або спыніць працоўныя адносіны».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ну і ну!

ВАРТАВЫЯ НЕ СПЯЦЬ

Тры вартаўнікі ААТ «Рыбгас «Трэмля», жыхары гарадскога пасёлка Капаткевічы, што ў Петрыкаўскім раёне, з сажалкі, якую павінны былі ахоўваць, ноччу выкралі каля 100 кілаграмаў рыбы — на паўмільёна рублёў. Цяпер вартасцю 400 тысяч рублёў стала здабыткам 50-гадовага вартаўніка і яго сябра. Жывёліну грамадзяне выкралі з малочна-таварнай фермы СВК «Агракамбінат Днепр». Яўка з павіннай, магчыма, зменшыць пакаранне.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЛОГОЙСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 22.09.2009 года открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельного участка

	Лот 1
Предмет аукциона	Земельный участок с кадастровым номером 62328200001000001, расположенный по адресу: д. Силичи, Логойский район, Знаменковский с/с. Срок аренды – 99 лет.
Характеристика объекта	Общая площадь земельного участка 1,00991 га. Назначение – для строительства придорожного сервиса.
Начальная цена	218 949 046 (двести восемнадцать миллионов девятьсот сорок девять тысяч сорок шесть рублей)
Сумма задатка	22 069 905 руб. (10 % от начальной цены)
Продавец	Логойский районный исполнительный комитет. Минская обл., г. Логойск, ул. Советская, д. 15, тел. 55 4 50 (код 8 017 74), 55 8 39 (код 8 017 74)

Аукцион состоится **22 сентября 2009 года** в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Советская, д. 15, третий этаж, актовый зал. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Советская, д. 15, отдел экономики. Последний день приема заявления **18 сентября 2009 года** до 17.00.

Аукцион проводится в соответствии с утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену.

К участию допускаются юридические лица, подавшие заявление установленной формы, копию платежного поручения, заверенную банком, подтверждающую внесение задатка в размере, указанном в извещении. Сумма задатка перечисляется на р/с № 3604061101564 в ЦБУ № 611 филиала № 500 — Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601, в г. Логойске. Получатель – Логойский райисполком, УНН 600181814.

Участнику необходимо в срок, указанный в извещении, подать заявление и подписать Соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и предоставить в уполномоченную организацию следующие документы:

- Заявление;
- Копию учредительных документов;
- Справку банка или небанковской кредитно-финансовой организации о наличии денежных средств на счете юридического лица или иные документы, подтверждающие платежеспособность юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе представители юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Договор аренды заключается на 99 лет.

Победитель обязан:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Логойским райисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с публикацией объявления.

2. После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом земельного участка заключается договор купли-продажи на право заключения договора аренды.

Логойский райисполком (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты его проведения.

Все расчеты производятся путем перечисления на р/с № 3604061101564 в ЦБУ № 611 филиала № 500 — Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601, в г. Логойске. Получатель – Логойский райисполком. УНН 600181814.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Кадастровый номер, Месторасположение земельного участка	Целевое назначение, Площадь, (га)	Условия продажи	Наличие инженерных коммуникаций, ограничений в использовании участка	Срок аренды, (лет)	Начальная цена продажи, (руб.)	Сумма задатка, (руб.)
Аукцион проводится 24 сентября 2009 года в 11.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65, каб. 34. Последний день приема документов 18 сентября 2009 года							
1	122582404602000011 Брестская обл., Жабинковский р-н, Ракитницкий сельсовет, 0,2 км западнее д. Федьковичи около автодороги М1/Е30 Брест (Козловичи)–Минск–граница Российской Федерации (Редьки)	Строительство автозаправочной станции с комплексом услуг, 1,5001 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в срок, не превышающий 2 года. Возмещение потерь в размере 47 896 170 руб. Возмещение убытков в сумме 12 788 643 руб.	Ограничение использования площади 0,0568 га в охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи. Возможность подключения газа, электричества	99	10 000 000	1 000 000
2	122550100002000278 Брестская обл., г. Жабинка, ул. Короткина	Строительство объекта производства, 3,1972 га	В течение 1 года разработать документацию и осуществить строительство в сроки до 2 лет	Ограничения по использованию 0,7882 га в связи с линией электропередачи 10кВ. Электричество, канализация, газ. Рядом ж/д станция «Жабинка», рампа	50	100 000 000	10 000 000
3	122582003102000016 Брестская обл., Жабинковский р-н, Озятский с/с, 0,5 км южнее д. Озяты	Строительство охотничьей усадьбы, 0,7958 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Возмещение потерь лесохозяйственного производства в размере 20 200 120 руб.	Ограничений нет. Вблизи рыболовные угодья ф/х «Мазович и К», охотничьи угодья	25	16 500 000	1 650 000
4	122581500002000021 Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский сельсовет, 38 км (право) автодороги М1/Е30 Брест (Козловичи)–Минск–граница Российской Федерации (Редьки)	Строительство объекта придорожного сервиса, 2,2905 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в сроки,определенные ПСД. Возмещение убытков в размере 202 136 000 руб.	Электричество. Ограничения по использованию 0,0985 га в связи с линией электропередачи до 1000 В. Рядом АЗС со стоянкой и мини-кафе	99	50 000 000	5 000 000
5	122581500002000020 Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский сельсовет, 40 км (лево) автодороги М1/Е30 Брест (Козловичи)–Минск–граница Российской Федерации (Редьки)	Строительство объекта придорожного сервиса, 1,2709 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в сроки, определенные ПСД	Рядом памятник природы «Дуб-великан» и старинный парк «Отечизна». Имеется электричество, водоснабжение, газ. Ограничения по использованию 0,0261 га в связи с линией электропередачи до 1000 В и 0,1076 га в связи с кабельной линией связи	99	50 000 000	5 000 000
6	122550100002000280 Брестская область, г. Жабинка, ул. Каменецкая	Строительство логистического комплекса с объектом торговли, 2,1994 га	В течение 1 года разработать документацию и осуществить строительство в сроки до 2 лет. Ориентировочный размер возмещаемых убытков 762 033 000 руб.	Ограничения на 0,0193 га из-за кабельной линии электросвязи, 0,0128 га – линии электропередачи до 1000 В, 0,1351 га – санитарно-защитной полосы водопроводов. Отдельный ж/д путь вдоль участка, 2-этажное административное здание 370 кв.м, асфальтнобетонное покрытие 6300 кв.м, вода, газ, электроснабжение	99	220 000 000	22 000 000
7	122550100002000291 Брестская обл., Жабинковский р-н, г. Жабинка, ул. Пионерская	Строительство автодрома, 0,2862 га	В течение 5 месяцев разработать документацию и осуществить строительство в сроки до 1 года	Электричество. Ограничений не выявлено	50	13 250 000	1 325 000
8	122580608102000009 Брестская обл., Жабинковский район, д. Стеброво	Строительство и обслуживание производственного здания по производству нетканых материалов, 1,0016 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в сроки, определенные ПСД	Электричество. Ограничений не выявлено	99	10 000 000	1 000 000
9	122580603602000003 Брестская область, Жабинковский район, д. Здитово	Строительство комплекса агроэкотуризма, 4,3329 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Возмещение убытков в размере 78 757 894 руб.	Электричество. Ограничения по использованию 0,0987 га в связи с линией электропередачи до 1000 В, 4,3329 га – водоохраной зоны р. Мухавец. Возле г. Жабинка на р. Мухавец, менее 1 км от Р7	50	12 316 450	1 231 650

Продавец и организатор аукционных торгов – Жабинковский райисполком. Аукционы проводятся по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65, каб. 34.

Для участия в аукционе предоставляются: заявление по установленной форме; заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3641600850051 в РКЦ № 2 г. Жабинка филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление, МФО 150501401, УНН 200038492, получатель платежа – Жабинковский райисполком;

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копия устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Участник аукциона, выигравший торги: подписывает протокол аукциона в день проведения торгов; не позднее 10 рабочих дней с момента вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возмещает расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона организатору аукциона; не позднее 12 рабочих дней с момента вступления в силу решения о предоставлении земельного участка подписывает договор купли-продажи объекта с продавцом.

Плата за объект и возмещение расходов осуществляются по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка.

Открытый аукцион будет считаться состоявшимся, если в нем приняло участие не менее двух участников по каждому участку. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: 225101, г. Жабинка, ул. Кирова, 65, каб. 35, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням с момента опубликования извещения.

Контактные телефоны в г. Жабинка: по вопросам организации и проведения аукциона – (8 01641) 2 36 78; по вопросам ознакомления с документацией, коммуникациями и осмотра земельного участка – (8 01641) 2 32 77.

«АЎТАЎРАГАН» НА ВУЛІЦАХ МІНСКА

Прыбор пад такой назвай ужо каля месяца дапамагае сталічным даішнікам выяўляць парушальнікаў за рулём. Цяпер уцячы ад адказнасці стала яшчэ больш складана.

...Беленькі мікрааўтобус спакойна рухаўся па вуліцы Матусевіча горада Мінска. Здавалася б, нікога не чапаў, правілы дарожнага руху не парушаў, навошта спыняць, дарэмна турбаваць кіроўцу? Але «Аўтаўраган» настойліва сігналізуе людзям у пагонах, што ўладальнік аўтамабіля (на маніторы ноутбука высвечваецца прозвішча, імя і год нараджэння мужчыны) летась быў пазбаўлены права на кіраванне.

25-гадовы Алег А. сваю віну не адмаўляў.

— Сапраўды, правы забралі яшчэ ў лістападзе за тое, што дазволіў сесці за руль ўласнага аўтамабіля нецвярозаму сябру.

— А чаму зараз самі селі за руль? Правоў жа няма...

— Спадзяваўся, што пранясе. Дарога — гэта мой хлеб. Працую на прыватнай фірме грузаперавозчыкам.

— Як жа мог наймальнік узяць на працу кіроўцу без адпаведнага пасведчання?

— На працы ніхто не ведае, што ў мяне няма пасведчання кіроўцы. Каб не выклікаць падазрэнні, нават афарміў машыну на сваё імя.

Як бачым, падмануць працадаўцу ў Алега атрымалася, але абвесці вакол пальца сучасны прыбор аказалася не пад сілу.

«Аўтаўраган», карэспандэнт «Звязды» пераканалася ў гэтым на свае вочы, аўтаматычна выхоплівае з транспартнага патоку машыны, якія выклікаюць падазрэнне. І падмануць новую сістэму, паводле слоў работнікаў ДАІ, практычна немагчыма.

«Аўтаўраган» у Беларусі пакуль што толькі ў адным экзэмпляры. Але пасля такога фурору іх колькасць, несумненна, павялічыцца.

— Сучасная праграма счытвае нумарныя знакі машын, якія праязджаюць («Аўтаўраган» здольны кантраляваць рух транспарту ў абодвух кірунках), і звярае з адзінай рэспубліканскай базай звестак адміністрацыйных парушэнняў, — тлумачыць прынцып дзеяння прыбора **старшы інспектар ДПС СП «Страла» МУС Беларусі Кірыл КАСЦЮК**. — ***У поле зроку апарата трапляюць кіроўцы, якія хаваюцца ад правасуддзя ці не маюць пасведчання кіроўцы***.

Паводле слоў **старшага лейтэнанта міліцыі, інспектара ДПС СП «Страла» МУС Беларусі Андрэя СТУЛЬСКАГА,** лепш за ўсё эфектыўнасць сістэмы ілюструе статыстыка.

— За суткі мы выяўляем пры дапамозе падказак «Аўтаўрагана» да 10 парушальнікаў. У асноўным гэта кіроўцы, якія не маюць права кіравання транспартнымі сродкамі ці пазбаўленыя пасведчання кіроўцы на нейкі тэрмін. Выявілі на вуліцах Мінска і адзін аўтамабіль, на які судом накладзены арышт.

Большасць затрыманых пра «Аўтаўраган» чыталі, але думалі, што «не так страшны чорт, як яго малююць».

— Я на днях складаў адміністрацыйны пратакол на аднаго мужчыну, — кажа Кірыл Касцюк, — дык ён расказваў, што напярэдадні сябра, які прачытаў пра «Аўтаўраган» у інтэрнэце, перасцерагаў яго ад паездак. «Чаму я яго не паслухаў, — дакараў сябе парушальнік. — Думаў, пранясе. А тут...»

— «Аўтаўраган» — выдатная знаходка для работнікаў ДАІ, — кажа Андрэй Стульскі. — Ён, я перакананы, дысцыплінуе заўзятых парушальнікаў. Бо, у адрозненне ад прыбораў, якія працуюць у стацыянарным рэжыме (напрыклад, сістэма «Паток»), «Аўтаўраган» нельга спецыяльна аб'ехаць. Па-першае, кіроўца не ведае, у якой патрульнай машыне знаходзіцца прыбор, па-другое, зараз мы можам стаяць на адной вуліцы, а праз пяць хвілін у іншым месцы.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

Дзённік бландзінкі

КАБ МЫ ТАК ЖЫЛІ!

Як адпачывалі гамяльчане сто гадоў таму?

Гулялі па парку княгіні Паскевіч, каталіся на лодках і... рабілі праменад па адкосе чыгункі паміж станцыяй Гомель і мостам рэчкі Сож.

А яшчэ яны масава выязджалі на дачы.

Тагачасныя журналісты выбівалі слязу ў абывацеляў: «Гарадская беднота ў пагоні за кавалкам хлеба не можа хоць бы на летнія месяцы адарвацца ад знясільваючай барацьбы за існаванне»...

Дачная тэма знайшла сваё адлюстраванне ў гумарыстычных каментарах на старонках мясцовых газет.

Вось іранічны расклад дня на дачы:

6 г. раніцы — пад самым акном лютуе ў дуду пастух.

7 г. раніцы — моцны стук булачніка ў дзверы.

8 г. раніцы — барытон: «Мяснік прыйшоў!»

9 г. раніцы — тэнар: «А вось і я, рыбачок!»

10 г. раніцы — першыя гукі грамафона.

11 г. раніцы — барышні замузыцыравалі.

12 г. дня — першы жабрак лезе проста ў летнік: «Падайце капеечку!»

1 г. дня — шарманшчык з'явіўся,

ад 2 да 5 ч. дня — крыкі разносчыкаў, гукі шарманкі, роў дзясятка грамафонаў...

6 г. вечара — вяртанне дачных мужоў са службы...

8 г. вечара — тапёр танцулькі зайграў.

10 г. вечара — бабы за вароты папляткарыць павыпаўзалі.

11 г. вечара — рандэву пакаёвак і дзеншчыкоў пачалося на вуліцы.

Што тут скажаш? Каб мы так жылі!

Пра ўсё гэта даведалася з працы гомельскай даследчыцы Аксаны Яшчанкі, якая перачытала «Гомельскую капейку» за 1910 — 1912 гг.

ПРА «ДРЭННЫХ» ДЗЯЦЕЙ

Сёння ехала на абед.

Галава забітая думкамі, таму выйшла не на сваёй станцыі метро. Аднак зразумела гэта толькі каля шкляных дзвярэй, калі пабачыла круглы пераход пад плошчай... Хацела павярнуць назад, але заўважыла, што проста каля сцяны стаіць жанчына ва ўзросце і яўна дрэнна сябе адчувае. Вочы амаль закаціла, на тварах — пот.

Падыходжу:

— «Хуткую» выклікаць?

— Ды не, спіну схапіла.

«Добра, — кажу, — давайце дадому адвяду». Бяру яе сумку — цагліны, не інакш! — і мы марудна-марудна ідзём па пераходзе.

Жанчына скардзіцца: :

— Харашо, калі дзеці малыя! І дапамогуць, і спытаюцца, як справы...

Я, спачувальна:

— Ведаеце, якія сучасныя людзі занятыя... Зноў жа, вось мой бацька скардзіцца, што я не званю і не расказваю, як справы. А пачынаю расказваць, дык ён за валідол хапаецца — адно расстройства ад мяне! І што лепш — ведаць ці не ведаць?

Жанчына цікавіцца яго ўзростам, я адказваю...

І тут яна пачынае весела рагатаць:

— Дык ён жа равеснік майго сына!!!

І з гонарам:

— Майму мужу ўжо 92!

Жанчынка падзякавала і зайшла ў пад'езд на Плошчы Перамогі.

Каб мы так жылі!

КРЫТЫКА ЯК УФАЛОГІЯ

Малады паэт Віталь Рыжкоў у нядаўнім інтэрв'ю прыгадаў сумны жарт пра беларускіх літаратурных крытыкаў, маўляў, яны, як уфолагі, даследуюць «неапазнаныя з'явы»... У той жа дзень на старонках «ЛІМа» прачытала і выказванне вядомага крытыка Ірыны Шаўляковай, што сучасны пісьменнік — асоба паўміфічная, «бы снежны чалавек, недзе ёсць, але мала хто з простых людзей яго бачыў».

КАВЯРНЯ Ў АРАНЖАРЭІ

Цэлы год прайшоў з таго часу, як я даведалася, што ў аранжарэі Батанічнага саду ёсць кавярня. І вось здарылася — знайшла ў яе ўваход!

Не, па звычцы я абышла ўсе больш-менш прыстойныя дзверы і зазірнула ў іх. Але ўваходна не было... І тут з неба спусціўся сімпатычны анёл мужчынскага полу і самым звычайным тонам, быццам бы ён спусціўся толькі дзеля таго, каб мне дапамагчы, сказаў — заўважце, без усякага пытання!: «А ўваход у кавярню трошкі далей». Рухомая яго мэсіджам я зайшла ў дзверы з непрыкметным надпісам «подвал», дзе была гасцінна сустрэтая маладым чалавекам, які вокамгненна прыняў заказ.

Цудоўны салат, смачныя дранікі, торт «Напалеон» і кава. Усё гэта падавалася так хутка, што мне хацелася казаць адно слова — «Фантастыка». Тым больш, што і сам будынак выглядае вельмі экзатычна, і ўнутры — ручаі, масточкі, трапічныя расліны...

Прызнаюся, я не ведаю месца, дзе б можна было так смачна і танна паесці. Апошняя дэталь мяне так расчуліла, што я шчыра паабяцала хлопцу прарэкламаваць гэты фантастычны пункт грамадскага харчавання.

Што з задавальненнем і раблю!

Ганна КІСЛІЦЫНА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.58	20.26	14.28
Віцебск —	5.44	20.19	14.35
Магілёў —	5.48	20.16	14.28
Гомель —	5.49	20.09	14.20
Брэст —	6.14	20.41	14.27
Гродна —	6.19	20.37	14.18

Месяц

Апошняя квадра 13 жніўня. Маладзік 20 жніўня.

Імяніны

Пр. *Германа, Іосіфа, Леаніда, Мікалая, Мірона.*

К. *Іаны, Казіміра, Францішка.*

НАДВОР'Е на заўтра



МТС — аграгарадкам

У ГОСЦІ ДА... РЭПІНА

Калі расказваць пра шматлікія цікавыя мясціны Віцебскага раёна, у першую чаргу трэба ўспомніць музей-сядзібу славутага на ўвесь свет мастака Ільі Рэпіна. Знаходзіцца гэты пасвойму ўнікальны музейны комплекс у Здраўнёве на беразе Заходняй Дзвіны.

На жаль, на момант падрыхтоўкі гэтага артыкула прамы рэйсавы аўтобус з Віцебска ў Здраўнёва не хадзіў. Ну дык турысты — людзі, гатовыя да розных нечаканасцяў. Пры добрым надвор'і можна і прайсціся пару кіламетраў, каб убачыць цуда-сядзібу. Чаму б і не? А каб не сумаваць па дарозе, можна каму-небудзь і патэлефанаваць з мабільнага тэлефона, падключанага на МТС.

Калі я прыехаў у Здраўнёва, сустрэў тут свайго таварыша Канстанціна Карнелюка (на фота). Даўно яго не бачыў. А тут такая прыемная, нечаканая сустрэча. Працуе ён музейным дазорцам. І вельмі ганарыцца гэтым. Сваю работу любіць — увесь час на прыродзе побач з такой прыгажосцю. Пашанцавала добраму чалавеку. Паказаў мне Канстанцін многа цікавага. Пачалі абменьвацца тэлефонамі. Высветлілася, што ён таксама абанент МТС. А якога ж яшчэ аператара?

Віцебскі раён ляжыць на мяжы са Смаленскай і Пскоўскай абласцямі Расійскай Федэрацыі. Расійская і беларуская кампаніі МТС — адна «сям'я». Безумоўна, і абанентам МТС тут прасцей заставацца мабільнымі, нягледзячы на межы. Чакаецца, што у сезон масавых водпускаў турыстаў тут будзе яшчэ болей.

Цікавіцеся тым, як жыве сучасная вёска? Ад Віцебска далёка ехаць не давядзецца. У аграгарадок Ноўка, не палянуйцеся, адпраўцеся пешшу. Як і ў Альгова. А ў Копці даволі хутка можна дабрацца на дызель-цягніку.

Пра гэтыя аграгарадкі мы ўжо расказвалі. І пра тутэйшых жыхароў. Вельмі часта пры знаёмстве я пытаў, ці задаволены яны дзейнасцю кампаніі МТС. Бясспрэчна, не абыходзілася і без крытыкі. Маўляў, тут вось, глядзіце, на гэтай вуліцы не вельмі ўстойлівы сігнал... А потым праходзіла вельмі няшмат часу, зноў прыязджаў туды ж у камандзіроўку і скаргаў на гэту тэму болей не чуў. Як падкрэслівае кіраўнік Віцебскага філіяла кампаніі МТС Уладзіслаў Андрэйчанка, кампанія заўсёды аператыўна рэагуе на звароты грамадзян, доўга не зацягваючы, вырашае праблемы абанентаў. Так што не трэба саромецца, звяртайцеся.

Музейны дазорца Канстанцін КАРНЯЛЮК.

Вы проста не маглі не чуць пра гімназію-інтэрнат для таленавітых і вельмі разумных дзяцей у Лужасне. Гэта таксама на тэрыторыі Віцебскага раёна. Будучыя геніі тут атрымліваюць добрую базу для наступнай рэалізацыі сябе ў самых розных галінах. Хто ведае, мо нехта з іх і акадэмікам стане, а пашасціць — і нобелеўскім лаўрэатам? Пакуль што яны, як і ўсе звычайныя юнакі і дзяўчаты, добра ведаюць, што такое сотавая сувязь і мабільны інтэрнэт. І заўсёды застаюцца на сувязі з роднымі...

МТС працягвае мабілізацыю як Віцебскага раёна, так і ўсяго Прыдзвінскага краю. Кожны абанент МТС на ўласным досведзе пераканаўся, як далёка наперад пайшла кампанія ў сваім развіцці. А ў наступных нумарах «Звязды» мы зноў адправімся ў падарожжа па паўночным рэгіёне краіны разам з МТС.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Віцебскі раён.

Дзве даты

21 жніўня

1862 год — у Магілёве было створана першае ў Беларусі і адно з найстарэйшых на тэрыторыі краін былога Савецкага Саюза Медыцынскае навуковае таварыства. Першы кіраўнік таварыства, якое тады мела назву — таварыства лекараў Магілёўскай губерні, доктар медыцыны А. Грабоўскі ўдзельнічаў у 1867 годзе ў рабоце Першага Сусветнага медыцынскага кангрэса ў Парыжы. У 1899 годзе ганаровым членам таварыства быў абраны заснавальнік Міжнароднага таварыства Чырвонага Крыжа Анры Дзюнан. Таварыства надавала шмат увагі барацьбе з інфекцыйнымі захворваннямі, паляпшэнню санітарнага стану горада, арганізацыі медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, правядзенню статыстычных і іншых даследаванняў, азнаямленню ўрачоў з найноўшымі метадамі абследавання і лячэння, абмеркаванню найбольш важных і цікавых выпадкаў з практыкі.

1968 год — войскі Варшаўскага дагавора ўвайшлі на тэрыторыю Чэхаславакіі для падаўлення «Пражскай вясны».

Цытата дня:

«Як усё-такі дзіўна, што розныя дробязі часта ўсплываюць у памяці, а тое, што хвалявала калісьці ўсур'ёз, — з гадамі забываецца».

Мурасакі Сікібу (978—1016), японская пісьменніца.

«СЛАВЯНСКІ» ТЫДЗЕНЬ

Разам з хрысціянствам Старажытная Русь павінна была прыняць і новы каляндар. Неабходна адзначыць, што звестак пра тое, якімі адзінкамі меры для вылічэння часу карысталіся нашы продкі, даволі мала. Ёсць меркаванні, што старажытныя славяне карысталіся месяцова-сонечным календаром. Гэта значыць, што яны добра ведалі пра фазы Месяца і рух Сонца па небасхіле, прычым Месяц адыгрываў першасную ролю, таму што меў меншы часавы перыяд (29,5 сутак) у параўнанні з сонечным годам (365 сутак).

● Пра тое, што славяне мелі «свой» тыдзень, сведчаць некаторыя факты. Напрыклад, калі амаль што ўсе еўрапейскія дзяржавы адна за адной прымалі «тыдзень» Старажытнага Вавілона і захавалі ў назвах дзён тыдня назвы старажытнарымскіх багоў, то старажытныя славяне прытрымліваліся зусім іншай традыцыі. Іх назвы дзён мелі парадкавы нумар, але не да сямі, а толькі да пяці, што, безумоўна, можа сведчыць пра старажытны «пяцідзённы» тыдзень: аўторак, трэцейнік (старажытная назва серады ў стараславянскай мове), чацвер, пятніца. Складаней з панядзелкам. На жаль, не захавалася яго старажытная назва, таму можна дапусціць, што першы дзень тыдня меў у сваім складзе корань «адзін» ці «першы».

● Старажытныя славяне стварылі свой пантэон багоў, ім не трэба было запазычваць тое, што ў іх ужо было на працягу многіх стагоддзяў. Богам неба, маланкі, навальніцы яны лічылі Перуна, што адпавядала рымскаму богу Меркурыю; богам святла і цяпла лічылі Хорса або Даждбога. Ладай звалі ахоўніцу кахання і шлюбу. Яе якасці даволі блізкія да якасцяў рымскай багіні Венеры. Цікава, але ў старажытных славян не было Бога, які быў ахоўнікам войнаў, што яшчэ і яшчэ раз даказвала міралюбны характар гэтага народа, таму ім не патрэбен быў рымскі бог вайны Марс. Значна пазней гэтую функцыю на сябе прыняў бог Пярун. Таму не трэба шукаць назвы планет у назвах дзён тыдня старажытных славян.

● Назвы двух апошніх дзён тыдня — субота і нядзеля выпадаюць з правіла называць дзень парадкавым нумарам. У іх назвах прыхаваны зусім іншыя характарыстыкі. Гісторыя фарміравання іудзейскай, а затым і хрысціянскай традыцый сведчаць пра тое, што старажытныя іудзеі першы дзень «вавілонскага» тыдня — суботу зрабілі апошнім днём сямідзённага тыдня, пакінулі назву, прысвяцілі Богу і забаранілі ў гэты дзень працаваць. Дакладна, пераклад слова «саббат» гучыць як «шабаш», што азначае спакой і адпачынак.

● Далей на працэс фарміравання структуры тыднёвага злічэння зрабілі ўплыў падзеі, звязаныя з жыццём і смерцю Ісуса Хрыста. Менавіта той дзень, калі ён пасля ўкрыжавання і смерці ўваскрэс, назвалі «ўваскрэсеннем» (воскресеньем) і зрабілі яго апошнім, сёмым днём тыдня. У II ст. н. э. рымскі імператар Адрыян забараніў «ісціянам хрысціянам святкаваць «старажытнаіудзейскую» суботу і сваім указам перанёс дзень адпачынку на наступны дзень — дзень Сонца. У 321 г. рымскі імператар Канстанцін таксама прыняў указ, згодна з якім гэты дзень стаў штотыднёвым дзяржаўным святам. Царква таксама прапанавала ўшаноўваць сёмы дзень тыдня ў гонар Збавіцеля, забараняла працаваць, прымушала менавіта ў гэты дзень прыгожа апранутымі збірацца ў храмах, каб удзельнічаць у царкоўных малебнах.

● Можа таму зусім невыпадкова гэты дзень у народнай традыцыі славяне «ахрысцілі» як дзень не-для-дзела — нядзеля. Першы дзень «славянскага» тыдня, які быццам бы згубіў сваё старажытнае імя, стаў звацца днём пасля «нядзелі» — панядзелкам (пасля-нядзелак).

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

— Да чаго ж твой малы падобны на твайго мужа!

— І не кажы. Сама дзіўлюся.

☺

На мінулым тыдні ледзь не адбылася трагедыя падчас рамонту труб — пасля чатырох гадзін працы ў сантэхнікаў нечакана скончылася лаянка.

☺

Калі жонка пілуе мужа, значыць хоча зрабіць з яго прыгожую палавіну.

☺

— Што саджаць у гэтым сезоне на садовым участку?

— Паспрабуйце пасадзіць самалёт.

Рэгіёны Расіі — у Беларусі

Сумесны беларуска-расійскі інфармацыйна-інтэграцыйны праект Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь і рэдакцыі газеты «Звязда»

Омская вобласць

Леанід Паляжаеў: «НЕАБХОДНА РАЗВІВАЦЬ ПРАМЫЯ КАНТАКТЫ ПАМІЖ РЭГІЁНАМІ»

Нядаўна пры падтрымцы Урада Омскай вобласці на базе акцыянернага таварыства «Механічны завод «Калачынскі» было створана новае расійска-беларускае прадпрыемства «Омсклідааграмаш» па зборцы камбайнаў «Ліда 1300». Сёлета ў гэтым расійскім рэгіёне будуць сабраны першыя 50 камбайнаў. Першыя дзесяць машын ужо сышлі з канвеера. Цяпер прадпрыемства атрымала сертыфікат на права выпуску камбайнаў гэтай маркі. Беларускія камбайны — больш танны аналаг амерыканскага збожжаўборачнага комплексу «КЕЙС-525». Да 2011 года тут плануецца павялічыць аб'ём вытворчасці да 150 машын у год, а долю расійскіх камплектавых частак давесці да 20 працэнтаў.

Гэты факт — вельмі характэрны штрых, які ілюструе цяперашні стан дзелавога супрацоўніцтва Омскай вобласці і Рэспублікі Беларусь. А як у гэтым расійскім рэгіёне ў цэлым ацэньваюць цяперашні ўзровень узаемадзеяння з беларускімі партнёрамі? На гэта і шэраг іншых пытанняў карэспандэнт «Звязды» папрасіў адказаць губернатара — старшыню ўрада Омскай вобласці Леаніда ПАЛЯЖАЕВА.



— Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва Омскай вобласці з Рэспублікай Беларусь мае шматгадовы вопыт, — адзначыў Леанід Канстанцінавіч. — Прадукцыя омскіх прадпрыемстваў і арганізацый запатрабаваная на беларускім рынку. У сваю чаргу, шмат беларускіх тавараў знаходзяць спажыўца на тэрыторыі вобласці. Двухбаковы тавараварот у апошнія гады характарызаваўся высокай станоўчай дынамікай. У мінулым годзе ён павялічыўся на 42,8 працэнта і склаў больш за 150 мільёнаў долараў. Развіваецца інвестыцыйнае супрацоўніцтва. Летась беларускія ўкладанні ў эканоміку Омскай вобласці павялічыліся ў 2,4 раза і склалі 21,7 мільёна долараў. Па аб'ёме накопленых замежных інвестыцый у эканоміцы вобласці Беларусь займае другое месца пасля Казахстана.

Лічбы гэтыя, бясспрэчна, дастойныя. Аднак акрамя камерцыйных, дзелавых інтарэсаў у нашым супрацоўніцтве ёсць не менш цікавая дэталь. У многім нашы пачуцці сілкуюцца агульнай культурай, гісторыяй і звычаямі. Такое разуменне маштабаў радзімы, не звязанае на адчуванні цяперашніх межаў, базіруецца на гістарычнай памяці народа, сувязі з яе былым, далёкім і агульным, асабістай прыналежнасці да гэтай агульнай, кроўнай, роднасці з яе мінулым і сучасным.

— Якія перспектывы ў цяперашніх умовах бачацца вам у плане ўмацавання рэгіянальнага ўзаемадзеяння з Рэспублікай Беларусь?

— Урад Омскай вобласці, кіраўнікі вядучых прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў бачаць асноўныя шляхі развіцця супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі па наступных кірунках: пастаўкі авіятэхнікі, у прыватнасці, самалётаў АН-3; пашырэнне паслуг па абслугоўванні і рамонце авіяцыйных рухавікоў, у тым ліку прызначаных і для баявой авіяцыі; пашырэнне паставак газатурбінных установак і парагенератараў; павелічэнне паставак омскіх гідраматараў і тармазных гідрацыліндраў для беларускіх вытворцаў трактарнай тэхнікі; стварэнне на базе омскіх вытворчых магутнасцяў сумеснага прадпрыемства па выпуску грузапасажырскіх ліфтаў з грузападымальнасцю 630 кілаграмаў. Добрую перспектыву мае і праект па стварэнні ў Омскай вобласці сумеснай вытворчасці колавых трактароў МТЗ. Да іншых значных напрамкаў развіцця двухбаковага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Омскай вобласці можна аднесці пастаўку ў рэспубліку абсталявання і вырабаў медыцынскага прызначэння, шырокага асартыменту аўтамабільных шын, розных марак каўчукаў, тэхнічнага вугляроду і іншых хімічных прадуктаў, арганізацыю выставачна-кірмашовых мерапрыемстваў.

— Якія карэктывы, на ваш погляд, неабходна цяпер унесці ў арганізацыю планавання і рэалізацыю сумесных праектаў з Рэспублікай Беларусь?

